ЛіМ

ГАЗЕТА
ТВОРЧАЙ ІНТЭЛІГЕНЦЫІ
БЕЛАРУСІ

ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА

13 КАСТРЫЧНІКА 1995 г. № 41 (3813) Кошт 2 500 руб.

ЁСЦЬ МОВА — ЁСЦЬ КРАІНА!

ВЫСТУПЛЕННЕ СТАРШЫНІ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ М. І. ГРЫБА НА IV З'ЕЗДЗЕ ТАВАРЫСТВА БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ ІМЯ ФРАНЦІШКА СКАРЫНЫ

Шаноўнае спадарства!

Паважаныя сябры беларускай мовы!

Скажу шчыра: мне вельмі прыемна быць сёння сярод вас! Быць сярод сумленных і праведных адраджэнцаў беларушчыны, сярод сапраўдных свяціл сучаснай беларускай нацыянальнай культуры. Такія падзеі, як ваш з'езд, такія сустрэчы пакідаюць след і памяць назаўсёды. І я ганаруся тым, што знаходжуся сёння разам з вамі!

Таварыству беларускай мовы імя Францішка Скарыны ўсяго некалькі гадоў. На вялікі жаль, мала, да крыўднага мала ў нас сёння такіх аб'яднанняў і суполак, як ваша, якія б сумленна і праведна, мужна і адкрыта спавядалі б свае мэты і задачы ў імя беларускага нацыянальнага Адраджэння. Думаю, не перабольшу, калі скажу, што асноўная мэта вашага таварыства — па-сапраўднаму святая. А заключаецца яна, як запісана ў пасведчанні аб рэгістрацыі вашага аб'яднання, у "аднаўленні ў грамадстве стаўлення да роднай мовы як да нацыянальнай святыні, пашырэнні ўжытку ва ўсіх сферах жыцця Рэспублікі Беларусь, усебаковым развіцці і захаванні яе чысціні і самабытнасці, садзейнічанні забеспячэнню ёй статуса адзінай дзяржаўнай мовы".

Такога таварыства, як ваша, наколькі мне вядома, акрамя Украіны, няма больш ні ў адной краіне свету. І калі зыходзіць з логікі, здаровага сэнсу гэта — не натуральна. Сапраўды, дзе, у якой яшчэ дзяржаве ёсць патрэба ў абароне роднай мовы, дзяржаўнай мовы?! Цывілізаваны свет да такога проста не дадумаўся.

А вось нам, беларусам, абараняць, прапагандаваць, распаўсюджваць роднае слова не тое што трэба, а проста неабходна. Хаця ўсім павінна быць зразумела: ёсць мова — ёсць нацыя, ёсць краіна! Няма мовы — няма нацыі, няма краіны!

Такія мае асабістыя падыходы да гэтага вельмі важнага дзяржаўнага пытання. І сказаў я ўсё не таму, што супраць Таварыства беларускай мовы, а таму, што ўпэўнены: у нашай складанай сітуацыі гэта — адно з выйсцяў са становішча.

Я асабіста не сумняваюся ў тым, што на вашым з'ездзе атрымаецца шчырая, глыбокая і зацікаўленая размова. І пойдзе гэта размова шмат па якіх накірунках. Бо вымагае таго час, тая рэчаіснасць, у якой мы апынуліся і вымушаны жыць і дзейнічаць.

Не думаю, што перабольшу, калі скажу: сёння мы жывём у час трывогі.

Трывогі за суверэнітэт і незалежнасць Рэспублікі Беларусь.

Трывогі за наша нацыянальна-культурнае Адраджэнне.

Трывогі за ўсё беларускае!

На вялікі жаль, ёсць і іншыя трывогі. І наша з вамі задача, наш з вамі святы абавязак — супрацьстаяць ім, не дазволіць пэўным сілам вярнуць Беларусь туды, дзе яна была яшчэ нядаўна!

Мы павінны быць вытрыманымі і мужнымі ў сваіх дзеяннях, перакананымі, што робім добрую, патрэбную і справядлівую справу.

Разам з тым я добра ведаю: ідэалы незалежнасці рэспублікі, ідэалы адраджэння нацыі сёння дарагія большасці нашага народа. І для таго, каб пераканацца ў тым, не трэба праводзіць рэферэндумы, заказныя апытанні і анкеціраванні. Трэба проста пабываць сярод простых людзей, пацікавіцца: чым, як, на якія сродкі, у імя чаго жыве наш чалавек сёння?!

Я цвёрда перакананы ў тым, што матэрыяльная нястача, недахват сродкаў на прыстойнае чалавечае існаванне — а гэта мы маем зараз скрозь і ўсюды — не прымусяць наш народ здаць суверэнітэт, пайсці да кагосьці па міласціну.

Шаноўнае спадарства!

Наша родная мова, як і зусім у недалёкія часы, зноў выцясняецца са штодзённага ўжытку. Выцясняецца на беларускім радыё і тэлебачанні, у іншых сродках масавай інфармацыі. Яшчэ больш трывожна за тое, што спыняецца адраджэнне нашай нацыянальнай школы. Дзе гвалтам, а дзе — з дапамогай ашуканства — ідзе русіфікацыя не толькі школ, тэхнікумаў, ВНУ, а і ўстаноў і арганізацый. Сумна ўсё гэта і трывожна. І давайце сёння разам падумаем, як гэты працэс спыніць!

Я не хачу сённяшнім выступленнем даць падставы гаварыць пра мяне як пра прапаведніка русафобіі. Я зусім не супраць прыгожай рускай мовы, але кожная павінна займаць сваё месца ў нашай краіне.

Пагэтаму давайце працаваць!

Праца, якая чакае нас усіх наперадзе, запатрабуе вялікіх сіл, энергіі, сапраўднай мужнасці. Але іншага выйсця няма. Наш народ, яго Вялікасць Беларуса трэба ў прамым сэнсе слова ратаваць. І найперш — праз абарону роднай мовы!

Я выдатна разумею: шлях да таго, калі беларускае слова сагрэе душы і сэрцы нашых людзей, яшчэ далёкі. Але гэта ваш, і мой асабісты, наш агульны шлях. Пойдзем разам! Я — як чалавек і грамадзянін, як дэпутат Вярхоўнага Савета цяперашняга, дванаццатага і наступнага, трынаццатага скліканняў — гатовы ісці з вамі! Я веру ў сваю Айчыну!

Дзякуй за ўвагу!



"З інакшай думкай пойдзе ў свет і людзі
Патомак гэты наш..."
Янка КУПАЛА

Фота А. КЛЕШЧУКА

ЛіМ КОЛА ДЗЁН

Каторы ўжо нумар запар галоўным героем лімаўскай "вертыкалі" — "Кола Дзён" — з'яўляецца Аляксандр Рыгоравіч. Так, пэўна, будзе і гэтым разам. Бо не дазваляе наш прэзідэнт забыцца пра сябе, не дае адпачынку ні сабе, ні журналісцкім пёрам, бо і сапраўды — з нашым прэзідэнтам не даводзіцца сумаваць...

ПРЫНЦЫПОВАСЦЬ ТЫДНЯ

Канстытуцыйны суд прызнаў усё-такі Указ прэзідэнта N 267, паводле якога ўносіліся змены ў мясцовыя бюджэты і прыпыняліся некаторыя льготы ваеннаслужачым і супрацоўнікам МУС і КДБ, устанаўлівалася платнае навучанне ў вячэрніх школах і павялічваліся акцызы на гарэлку і інш. — не адпавядаючым Канстытуцыі і законам Рэспублікі Беларусь. Гэтае рашэнне дае падставы для размоў аб магчымым імпічменце прэзідэнта. Толькі хто зможа гэта зрабіць?.. Зразумела, найперш Вярхоўны Савет, легітымнасць якога пацвердзіў на сваім апошнім пасяджэнні Канстытуцыйны суд. Толькі вось ці зможа быць наш цяперашні ВС гэтакім прынцыповым у адстойванні справядлівасці, як КС.

"РАМОНТ" ТЫДНЯ

З месяц таму прэзідэнт прыняў рашэнне аб адмене льгот для міліцыянераў і ваеннаслужачых, у тым ліку і тых, што тычыліся бясплатнага праезду на транспарце. Паспешлівасць і непрадбачлівасць гэтага рашэння заўважалася ўжо тады. І вось у рэшце рэшт прэзідэнт быў вымушаны прызнаць сваю памылку і даць распараджэнне аб увядзенні спецыяльнага знака на дазвол бясплатнага праезду ваеннаслужачым і міліцыянерам. Пасля многіх апошніх указаў прэзідэнта і дапрацовак, " рамонту" іх услед, прыгадваецца адна савецкая народная прыкмета: "На вашай вуліцы паклалі новы асфальт — значыць, чакайце, што хутка яго будуць зрываць і пракладваць трубы..."

ЦЫТАТА ТЫДНЯ

"Калі большасць былых дзяржаў Савецкага Саюза сілаю вядуць у расійскае лона, Беларусь, трэцяя "славянская" апора былога СССР, дзіўным чынам вылучаецца быццам бы добраахвотным адмаўленнем ад суверэнітэта, аб'яўленага ў 1991 годзе ў час гістарычнага саміта ў Мінску, які завяршыў 70-гадовую эру савецкага камунізму. Гэтая асаблівасць не столькі з'яўляецца паказчыкам слабасці нацыянальнае самасвядомасці жыхароў Беларусі, якой на працягу стагоддзяў кіравалі то з Масквы, то з Варшавы, колькі вынікам жорсткага эканамічнага маразму, які прымушае насельніцтва гэтай краіны прымаць Расію за краіну казачных багаццяў. Вярнуўшы на травеньскім рэферэндуме старыя сімвалы, праўда, без сярпа і молата, беларускія выбаршчыкі таксама выказаліся за эканамічную інтэграцыю з Расіяй. Але гэтае збліжэнне, лепш сказаць, зліццё, у многім з'яўляецца вынаходствам непрадказальнага і вельмі аўтарытэтнага прэзідэнта Аляксандра Лукашэнкі. Карыкатурнае ўвасабленне "гома саветыкуса", гэты былы дырэктар саўгаса ўжо паказаў сябе ў 1991 годзе, калі быў адзіным дэпутатам, які прагаласаваў супраць незалежнасці". *(Газета "Свабода", N 41, перадрук артыкула з газеты "Le Monde").*

БЯСПЕКА ТЫДНЯ

Нічым закончылася нядаўняя сустрэча міністраў замежных спраў краін СНД у Маскве. На разгляд было вынесена 17 дакументаў, у тым ліку аб удзеле войск краін Садружнасці ў міратворчых аперацыях Расіі ў краінах постсавецкае прасторы, а таксама аб стварэнні рабочых органаў для кіраўніцтва гэтай дзейнасцю, але ні адзін з іх не быў падпісаны. Ніхто не хоча пасылаць сваіх дзяцей ваяваць за чужыя інтарэсы. Шмат вады сцякло з таго часу, як за сваё нежаданне падпісаць дакументы аб калектыўнай бяспецы "зляцеў" С.Шушкевіч, а справа так і не зрушылася з месца. Хоць сёй-той на нейтральнай Беларусі вельмі ж дамагаецца ваеннага саюза з ваюючай суседкай.

ФАКТ ТЫДНЯ

З трыльёны 974 мільярды 67 мільёнаў беларускіх рублёў складае на верасень агульны доўг Беларусі за расійскі газ. Нягледзячы на запэўніванні прэзідэнта, што ён апошнім часам плаціць за ўсё і што яму дорага абыходзіцца незалежнасць, гэта лічба пастаянна расце. Павялічваецца і наш доўг за электраэнергію, мазут... Гэта ж пацвердзіў у сваім інтэрв'ю газеце "Имя" былы старшыня Нацбанка С.Багданкевіч: "Гэта няпраўда, што з моманту прыходу новай улады мы плацім Расіі за энерганосьбіты па льготных расцэнках. Даўгі за энерганосьбіты ў нас выраслі амаль на дзевяноста мільёнаў долараў, а ў апошнія месяцы неплацяжы павялічваюцца і складаюць каля 50 працэнтаў..."

ЮБІЛЕЙ ТЫДНЯ

Газета "Рэспубліка" на мінулым тыдні адзначыла выхад свайго 1000-га нумара. За кароткі час гэтае выданне ўвайшло ў лік самых папулярных і тыражных на Беларусі. Хай і са спазненнем, але далучаемся да віншаванняў, што прагучалі ў гэтыя дні ў адрас калег. Ад "ЛіМа" ж пажадаем, каб "Рэспубліка", нарэшце, стала не па статуце, а наяве, двухмоўным выданнем...

СУСТРЭЧА ТЫДНЯ

У перапынку футбольнага матча паміж нацыянальнымі зборнымі Беларусі і Чэхіі аматары футбола згледзелі ў гасцёвай ложы стадыёна ўсенароднаабранага. І прывіталі яго дружнымі крыкамі "Жыве Беларусь!", размахваннем бел-чырвона-белым сцягам і свістам. Прэзідэнт сустрэў прывітанні, якія надта былі падобнымі на нешта зусім іншае, стрымана і футбол дагледзеў да канца.

ЛАЎРЭАТЫ ТЫДНЯ

У Маскве падведзены вынікі чацвёртага Міжнароднага кінафестывалю славянскіх і праваслаўных народаў "Залаты віцязь". Сам "Залаты віцязь" прысуджаны Прэзідэнту Беларусі А.Лукашэнку, "Сярэбраны віцязь" дастаўся Уладзіміру Замяталіну. Усяго ж беларускія кінематаграфісты атрымалі шэсць высокіх узнагарод. "Скульптуру воіна-пераможцы" за фільм "Нянавісць" заваяваў на фестывалі Юрый Азаронак.

АБСУРД ТЫДНЯ

Прэзідэнт прыняў рашэнне аб увядзенні адзінага палітдня, на якім у рабочых калектывах будзе тлумачыцца палітыка... краіны. У суцэльныя палітінфармацыі ператварыліся апошнім часам выпускі навін БТ і нагадваюць праграму "Время" брэжнеўскіх часоў, пра якую казалі: "И это все о нем и... немножко погоды". Першыя палосы афіцыйных газет ператвораны ў "падручнікі" для палітінфармацый. І вось наступны крок... У савецкія часы гэтыя мерапрыемствы, памятаецца, выклікалі толькі смех. Сёння ж нам ужо не да смеху...

"ПРАПОЛКА" ТЫДНЯ

11 кастрычніка чарговы нумар незалежнай штодзённай газеты "Народная воля" не выйшаў... У выдавецтве "Беларускі Дом друку" адмовіліся друкаваць газету, спасылаючыся на ліст У.Замяталіна, у якім гаварылася пра парушэнне "Народнай воляй" Закона Рэспублікі Беларусь "Аб друку..." Які канкрэтна пункт закона парушаны, ніхто не можа патлумачыць. Пагроза "прыкрыцця" навісла і над незалежнымі газетамі "Имя" і "Белорусская деловая газета". З гомельскай друкарні "Сож" паведамілі, што ў сувязі "з прафілактычным рамонтам", з наступнага тыдня, хутчэй за ўсё, друкаваць тут гэтыя выданні не змогуць... Мяркуючы па інфармацыі пра гэта ў "Народнай газеце", таварыш Замяталін распачаў "цэнзарскую "праполку" газетнага агарода"...

З нагоды

ІМЕМ ЗАКОНА

Апошнія паўгода мне асабіста некаторыя публічныя выказванні прэзідэнта А. Лукашэнкі нагадвалі прамовы аднаго са старажытных рымскіх сенатараў, якія той з маніякальнай настойлівасцю заўсёды заканчваў словамі: "Карфаген павінен быць разбураны!" Разумею, што гістарычныя паралелі — рэч рызыкоўная, але ўсё ж, усё ж... Што я маю на ўвазе? Зайздроснае пастаянства, з якім Аляксандр Рыгоравіч аб'яўляе Вярхоўны Савет незаконным, немаючым права на існаванне, бо вычарпаў нібыта адпушчаны яму ліміт часу. І таму ніводнага прынятага ім заканадаўчага акта ён, прэзідэнт, прымаць да ўвагі не будзе. І гэта не былі словы, кінутыя на вецер. Прэзідэнцкія ўладныя структуры рабілі ўсё, каб перакрыць кісларод вышэйшаму органу прадстаўнічай і заканадаўчай улады — ад спынення яго фінансавання да прамога ўціску народных абраннікаў з пагрозамі пазбавіць іх працы, калі яны будуць працягваць выкананне сваіх дэпутацкіх абавязкаў.

Вось чаму такую ўвагу грамадскасці прыцягнула да сябе ініцыятыва кіраўнікоў трох праваахоўных структур краіны: старшыні Вярхоўнага суда У. Каравая, в. а. Генеральнага пракурора В. Капітана і старшыні Вышэйшага гаспадарчага суда У. Бойкі паставіць перад Канстытуцыйным судом Рэспублікі Беларусь пытанне аб адпаведнасці Канстытуцыі артыкула 7 Закона аб Вярхоўным Савеце, які вызначае тэрмін яго паўнамоцтваў.

Два дні, 11 і 12 кастрычніка, Канстытуцыйны суд на вачах шматлікай публікі, аснову якой складалі журналісты, аддаў разгляду гэтага пытання. І вось, нарэшце, пасля шматгадзіннага пасяджэння за зачыненымі дзярыма ў дарадчым пакоі, Высокі суд выходзіць у залу пасяджэнняў і вуснамі яго старшыні В. Ціхіні выносіць свой вердыкт, сутнасць яго такая: з-за таго, што на мінулых выбарах новы склад Вярхоўнага Савета не быў абраны ў прадугледжанай законам колькасці і прыступіць да выканання сваіх абавязкаў да правядзення дадатковых выбараў не можа, лічыць артыкул 7 Закона аб Вярхоўным Савеце, які прадугледжвае працяг яго паўнамоцтваў да першага пасяджэння новаабранага складу парламента ў прадугледжанай законам колькасці, — адпаведным Канстытуцыі і, такім чынам, цяперашні, 12 склікання склад Вярхоўнага Савета з'яўляецца законным. У прававой дзяржаве, адзначана ў рашэнні Канстытуцыйнага суда, не павінна стварацца становішча, пры якім адна з галін улады, у дадзеным выпадку заканадаўчая, можа аказацца паралізаванай, пазбаўленай магчымасці нармальна функцыянаваць.

P. S. Пасля аб'яўлення судовага рашэння журналісты ўзялі ў "палон" В. Капітана і У. Бойку (У. Каравай паспеў з залы знікнуць), закідаўшы іх пытаннямі адносна толькі што прагучаўшага вердыкту КС. Трэба сказаць, што і адзін, і другі не выглядалі засмучанымі і нават выказалі сваё задавальненне тым, як скончылася справа. Сваю ініцыятыву звярнуцца ў Канстытуцыйны суд яны вытлумачылі пільнай неабходнасцю прыняцця ў бліжэйшы час Вярхоўным Саветам шэрагу заканатворчых актаў, да прыкладу, Закона аб новым Крымінальным кодэксе краіны, Закона аб банкруцтве і інш. "Нам трэба было высветліць, ці мае цяперашні парламент для гэтага належныя паўнамоцтвы, — растлумачыў в. а. Генпракурора, — цяпер мы бачым, што мае".

На здзеклівае пытанне аднаго з журналістаў, ці не ініцыіраваў іх "ініцыятыву" сам прэзідэнт, абодва адмоўна закруцілі галовамі, маўляў, яны свой крок з прэзідэнтам не ўзгаднялі.

Ну, што ж, паверым у гэта... Што далей? Ці дасць вердыкт Канстытуцыйнага суда, які, паводле закона, з'яўляецца канчатковым і перагляду не падлягае, спакойна і плённа працаваць парламенту? У мяне асабіста ёсць пэўныя сумненні, выкліканыя, да прыкладу, апошняй заявай прэм'ер-міністра М. Чыгіра аб тым, што, нягледзячы на рашэнне Канстытуцыйнага суда аб прызнанні не адпавядаючым Канстытуцыі прэзідэнцкага ўказа аб зменах у прынятым Вярхоўным Саветам бюджэце, ён усё роўна будзе выконваць указ. Няўжо прававыя, канстытуцыйныя нормы для нашага прэм'ера, неабавязковыя, як для любога законапаслухмянага грамадзяніна.

М. ЗАМСКІ

Анонс

АКАДЭМІІ МАСТАЦТВАЎ — 50

Беларуская акадэмія мастацтваў святкуе сёлета свой пяцідзесяцігадовы юбілей. Для гісторыі паўстагоддзя — невялікі тэрмін, для акадэміі гэта адрэзак часу стаўся вызначальным. За пяцьдзесят год акадэмія нарадзілася, узмужнела і сцвердзілася ў творчай сталасці сваіх былых вучняў. Цяпер прыспеў час падсумаваць зробленае, азіраючыся на пройдзены шлях. Наперадзе — урачыстыя мерапрыемствы, што прадставяць гісторыю і сённяшні дзень акадэміі.

13 кастрычніка адбудзецца адкрыццё ў Нацыянальным мастацкім музеі выставы творчых прац выкладчыкаў акадэміі. 17 кастрычніка ў музеі акадэміі распачнецца выстава выкладчыкаў і студэнтаў Мюнстэрскай акадэміі мастацтваў. 20 кастрычніка ўрачыстае пасяджэнне Вучонай рады завершыцца святочным канцэртам студэнтаў. 24 кастрычніка адкрыецца рэтраспектыўная выстава студэнцкіх прац у Рэспубліканскай мастацкай галерэі, а 26 кастрычніка — выстава прац выкладчыкаў факультэта дызайну ў музеі акадэміі. 27 кастрычніка адбудзецца ў Белдзяржфілармоніі ўрачысты вечар, прысвечаны юбілею. У план святочных мерапрыемстваў уключаны таксама адкрыццё Музея сучаснай скульптуры імя А. Бембеля (30 кастрычніка) і навукова-метадычная канферэнцыя прафесарска-выкладчыцкага складу БелАМ (10 лістапада).

Меркаванне

"ЗАПАДНО — РУССКИЕ" ІДУЦЬ!

Не вельмі даўно, падчас найбольш вострага супрацьстаяння камунізму й нацыянал-дэмакратызму, шмат хто гаварыў пра тое, што, апрача двух вышэйзгаданых ідэалогій, сіл, на палітычнай арэне Беларусі з'явіцца й нейкая іншая, трэцяя сіла, якая зусім сур'ёзна зможа паспрачацца за ўладу.

Прагнозы спраўдзіліся, і такая ідэалогія з'явілася, стаўшы, прычым, не "трэцяй", а "першай". Яна не ўзялася з неадкуль, і яе прыход не быў нечаканы. З канца 18 ст. яна не давала "истинно-русским" спакойна глядзець на нацыянальны рух у Паўночна-Заходнім краі, дажыла да года ўтварэння БССР, потым ненадоўга знікла, і адрадзілася ў закамуфляваным, замаскаваным выглядзе ў тыя часы, калі ў Мінску пайшла пад нож кніга А. Цвікевіча з назовам "Западно-руссизм".

Так, сёння нашая дзяржаўная ідэалогія — панславізм. Але чый гэты панславізм? Бо ён абавязкова павінен быць чыйсьці. Прайшло ўжо не тры і не пяць стагоддзяў з тых часоў, калі ён быў сапраўды "нічый", г. зн. ніводзін з народаў, якія патэнцыяльна маглі ўтварыць панусходнеславянскую дзяржаву, не быў настроены непрыкрыта шавіністычна й пагарджальна да сваіх "братоў", а агульная дзяржава можа ўтварыцца толькі для таго, каб "славянам лепей жылося", а не для адваявання адзін у аднаго "жыццёвай прасторы".

Выдатны помнік такой эпохі, такіх настрояў — наскрозь панславісцкае "Слова пра паход Ігаравы". Тады гэта было прагрэсіўна, гэта быў крок наперад, шчыры заклік да аб'яднання, каб супрацьстаяць знешнім ворагам.

Але часы мяняліся, розныя славянскія народы жылі ў розных дзяржавах, набіралі моцы, стваралі сваю культуру і, калі займалі ў краіне дамінуючае становішча — сваю ідэалогію. У тым ліку і панславісцкую. І чым мацнейшаю была дзяржава, тым большыя былі яе імперскія амбіцыі. Так было пэўны час і ў ВКЛ з вялікалітоўскай ідэяй аб'яднання ўсіх земляў усходніх славян на чале з Княствам, так было і ў Масковіі, якая, набраўшыся моцы, пачала вельмі шырока выкарыстоўваць гэтую ідэю аб'яднання, ды, безумоўна, з Масквою "ў галоўнай ролі".

Панславізм, як шчырае імкненне зрабіць добра ўсім славянам, ужо не існуе (калі толькі ён сапраўды існаваў у такой форме). Ён даўно ўжо ўяўляе сабою ўсяго толькі прыгожыя (ці не надта) словы, за якімі хаваецца нечае неадольнае жаданне пашырыць сваю тэрыторыю.

А наконт таго, чый жа ў Беларусі панславізм ("беларускі", "расійскі", "украінскі", "сербскі" ці яшчэ які), адказваць няма ніякае патрэбы. Усе і так добра ведаюць.

"Расійскі" панславізм (г. зн. імкненне стварыць агульную дзяржаву на чале з Масквой, альбо аднавіць Расійскую імперыю) існуе ў нас як блізкі й родны некаторым беларусам "западно-руссизм". У нас ёсць свае "западно-русские" партыі: ЛДП, СС "Белая Русь"; не так яўна з гэтых пазіцый выступаюць камуністы, але тое, што кампартыя ў нас нашмат больш (а можа, й зусім) "западно-русская", чым беларуская — сумненню не падлягае.

Цяпер панславізм перамагае ў Расіі, пра што яскрава сведчыць заява Савета Федэрацыі аб правядзенні рэферэндуму наконт эканамічнай і палітычнай інтэграцыі з Беларуссю. Але ён (і ідэалы ЛДПР) даўно ўжо перамаглі ў Беларусі. Падчас выбараў прэзідэнта Лукашэнку падтрымліваў СС. Праўда, потым, амаль перад днём выбараў, яны нібыта праз нешта разышліся, але як паказала далейшая гісторыя — ненадоўга. Колькі Саўцаў зараз набліжана да прэзідэнта — ніхто нават не лічыў. Нядаўна старшыня беларускай філіі жырыноўцаў (ЛДП) у інтэрв'ю "Звяздзе" гаварыў: "Са "Славянскім саборам" мы не сталі ствараць юрыдычна афармленага блока, а пайшлі далей... Партыя

Архівы

"ДРУКАВАННЮ НЕ ПАДЛЯГАЕ"

"Круты паварот ва ўсёй палітыцы", які прывёў да маштабных сацыяльных зрухаў і ўзрушэнняў ва ўсіх рэспубліках былога Саюза, Сталін і яго акружэнне рыхтавалі з сярэдзіны 20-х гадоў. У Беларусі аб небяспеках "рэстаўратарскіх уплываў" ва ўмовах "разгорнутага НЭПа" першы сакратар ЦК КП(б)Б А.Крыніцкі адкрыта заявіў у верасні 1925 г., выступаючы з дакладам "Асаблівасці ўнутрыпартыйнага становішча КП(б)Б" на сходзе членаў бюро ячэек Мінскай гарадской партыйнай арганізацыі.

На сярэдзіну 20-х гадоў прыпадае і пашырэнне маштабаў палітычнага кантролю за духоўнай сферай і рознымі праявамі грамадскага жыцця. Сродкам такога кантролю з'яўлялася Галоўнае ўпраўленне па справах літаратуры і выдавецтва (Галоўліт), створанае згодна з пастановай СНК БССР у студзені 1923 г. Яно павінна было забараняць выданне твораў, у якіх, па меркаванні парторганаў, мелі месца выказванні, накіраваныя супраць савецкага дзяржаўнага ладу і да т.п. У Беларусі Галоўліт быў структурным падраздзяленнем Наркамасветы, а ў палітычным плане падпарадкоўваўся аддзелу друку ЦК КП(б)Б.

Ніжэй друкуецца шэраг распараджэнняў Галоўліта за 1926 год. З іх яскрава бачна, што нарастанне палітычнага кантролю і ўціску паступова распаўсюджвалася на ўсё грамадскае жыццё, як яго духоўна-культурную, так і эканамічную сферы. Дакументы падаюцца з захаваннем моўных асаблівасцей таго часу.

Р.ПЛАТОНАЎ, галоўны навуковы супрацоўнік БелНДЦ дакументазнаўства, археаграфіі і архіўнай справы

N 10 С *Сэкрэтна*
5 студзеня 1926 г. Абежнік

Усім Акрлітам

Галоўрэпертком БССР паведамляе для ведаў, што п'еса Юр'іна "Себя казнивший" (бывш. "Конь вороной") дазволена дзеля пастаноўкі выключна ў гэткай рэдакцыі, якая прынята ў Ленінградзе. У ёй вытручаны, па магчымасці, усе жыццяпісаныя збежнасці героя п'есы з Савінкавым — гэтак, каб Андрэй Паліванаў застаўся ў прадстаўленні гледзяча (зрителя) як абагульнены тып рэвалюцыйнага інтэлігента, не ведаўшага Рэвалюцыі, калі яна прыйшла. П'еса партрэтна, і разаблачаць гэты момант у рэцэнзіях і папярэдне рэкламах строга забараняецца. У гэтай рэдакцыі "Себя казнивший" можа быць дазволена дзеля ўсялякай аўдыторыі.

Старшыня ІРК (Арэшнікаў)
Інструктар відовішча (Ярош)
Сакратар (В.Суднік)

N 27/с *Зус.сакрэтна — Абежнік*
28 чэрвеня 1926 г.
г.Менск

Усім Акрлітам і Палітрэдактарам

Твор Пільняка "Повесть непогашенной луны", у якім ідзе размова аб смерці (пры аперацыі) камандарма Гаўрылава, друкаванню не падлягае ні ў якім выпадку.

У разе, калі гэтая повесць паступіць да Вас для прагляду пад паказанай вышэй назвай ці якой-небудзь іншай, цалкам ці ў адрыўках, Галоўлітбел просіць тэрмінова паведаміць яго аб гэтым, а рукапіс да друкавання забараніць і пераслаць яе сакрэтна ў Галоўліт.

Загадчык Галоўліта Арэшнікаў
Сакратар Суднік В.

Н.Чарнушэвіч. "Жыццёвыя ўсмешкі". Вершы.

[У архіўнай папцы з матэрыяламі аддзела друку ЦК КП(б)Б і абежнікамі Галоўліта падшыта 8 вершаў паэта з паметкамі і заўвагамі палітычных рэцэнзентаў. У якасці прыкладу прыводзіцца верш "А калі, калі ты прыдзеш..." з падкрэсліваннямі, да якіх прыцягвалася ўвага супрацоўнікаў аддзела]

Стар. 26—27.

А калі, калі ты прыдзеш.
мой далёкі Заўтрага дружа...
Я таплюся, капаю ў крыўдзе
на крыжы распінаю душу.
А навокал — цвіце бездар'е,
а навокал -- нявольнікаў радасць...
Не, не госць я на гэтым балі,
хай адзін лепш буду жабрачыць.
Хай адзін загіну у хвалях
густалісця лясоў Беларусі —
Не дазволю тупой навале
мае сэрца схаваць пад абрусам.
Ці аб гэтым гадаў і марыў
на бязмежжы нядаўняга ўчора...
Ой, як мала паветра, мала —
Нешта рук ня слухае човен.
Мо не здамся, мо вынесу буру...
ды не ў гэтым, нарэшце, і справа —
Ты ідзеш, і з табою разбурым
А НЯДОЛІ ГОРКАЕ СЛАВУ.

[Надпіс на палях: аб чым пяе...]

Стар.141

Тваю сцежку не кожны пазнае,
не растуць па ёй вохкія ружы...
Табе весніцы я адчыняю,

МОЙ ДАЛЁКІ ЗАЎТРАГА ДРУЖА.

С/секретно

циркулярно

Всем Окрлитам и Политредакторам

Главлит предлагает без согласования с органами ОГПУ не допускать опубликования в прессе сведений, заранее точно указывающих время и место выступлений, как в Москве, так и вне, с докладами, лекциями и т.п. ответственных Членов Советского правительства и Политбюро ЦК РКП(б).

24 апреля 26 г. Зав.Главлитбелом Орешников
N 186с Секретарь Судник В.

N 246с *Сов.секретно*
9 июня 1926 г.
г.Минск

Всем Окрлитам

Из ознакомления с состоянием инвентаря некоторых книгохранилищ БССР выяснилось, что абоненты на полях книг вождей Октябрьской революции делают подчас карандашом или чернилами заметки недопустимого свойства.

На полях собр.сочинений Ленина — ругательства по адресу Владимира Ильича, подчас витиеватые меньшевистского толка редакции строк на 30 и т.д. С этим явлением нужно покончить в корне.

Главлитбел предлагает Вам в срочном порядке вызвать к себе зав. библиотеками, действующими во вверенном Вам округе, отобрать от них обязательство в том, что по возвращении книги от абонента, если таковая принадлежит перу тт.Ленина, Зиновьева, Сталина, Маркса, Энгельса, Бухарина, Троцкого, Калинина и т.д., просмотреть ее по страницам. В случае обнаружения каких-либо пометок, взыскать с абонента стоимость книги, книгу препроводить в Окрлит, а Окрлиту направить ее в ПК. Конечно, о ПК упоминать библиотекарю ни в коем случае нельзя.

Время от времени (не чаще 2-х раз в месяц) завокрлит проверяет библиотекаря путем беглого просмотра упомянутых книг.

Зав.Главлитбел П.Орешников
Секретарь Судник В.

В секретариат ЦК КП(б)Б

Отдел печати обращает Ваше внимание на участившиеся в органе ЦК КП(б)Б "Звезда" технические ошибки и опечатки, могущие быть подхваченными контрреволюционными элементами.

В номерах под клише Ворошилова — надпись "Не до жиру, быть бы живу", под клише английского рабочего с протянутой рукой о помощи — надпись "Сами себя бьют". Был случай, когда под клише Сталина надпись — "Лакеи Антанты".

Эти невинные ошибки по очевидной вине выпускающего вызвали не только кривотолки среди читательской массы "Звезды", но и могут быть подхвачены белой прессой как "пикантные советские анекдоты".

Зав.отделом печати ЦК

N 272/с
29 чэрвеня 1926 г. *Зус.сакрэтна*
г.Менск Абежнік

Усім Акрлітам

Некалькі дзён таму назад ініцыятыўная група, у склад якой уваходзяць гр-не Сасенскі, Фрыд, Шапіра, Каган, Бернштэйн і Кацаў, звярнулася ў Галоўлітбел з просьбай даць дазвол на наладжанне "Вечара новае яўрэйскае літаратуры і музыкі на стара-яўрэйскай мове". З прычыны таго, што па маючымся ў нас вестках гэтая група ідэалагічна звязана з сіянізмам, які за апошні час набыў відочны антысавецкі характар, Галоўлітбел, па ўзгодненасці пытання з адпаведнымі органамі, — у арганізацыі вечара адмовіў.

Паведамляючы аб гэтым, Галоўлітбел прапануе Вам у разе, калі прадстаўнікі памянёнае групы звернуцца да Вас з просьбай аб выдаче дазволу на падобны вечар, — дазволу ні ў якім выпадку не даваць.

Заг.Галоўлітбелу (Арэшнікаў)
Сакратар (Суднік В.)

N 227/с *Сакрэтна-абежнік*
25 траўня 1926 г.
г.Менск

Усім Акрлітам і Палітрэдактарам

За астатні час ў перыядычным друку і часопісах з'явіўся цэлы шэраг артыкулаў і заметак аб дзейнасці Салавецкіх канцлагераў АДПУ і аб жыцці вязняў у іх, пры чым матарыялы аб гэтым пастаўляюць з розных бакоў.

Галоўлітбел прапануе не дапушчаць без дазволу Спэцаддзела АДПУ памяшчэння ў прэсе памянёных артыкулаў, заметак і інш.

Нам.заг.Галоўлітбела (Гурскі)
Сакратар (Суднік В.)

N 130с *Зус.сакрэтна*
15 сакавіка 1926 г.
г.Менск

Усім Арклітам і Палітрэдактарам

У развіццё і паясненне параграфа 26 Вайсковага Пераліку, Галоўлітбел напамінае Вам, што ўсе друкаваныя матарыялы (допісы, інтэрв'ю, заметкі і г.д.), у каторых у той ці іншай ступені прама ці косвенна фігуруюць органы ДПУ, а таксама да іншыя весткі, падлягаючыя візіраванню ДПУ, ні ў якім разе не павінна апублікавацца без узгаднення з меснымі органамі Аддзела інфармацыі і Паліткантролю ДПУ.

У тых выпадках, калі ДПУ будзе распалагаць матарыяламі, маючымі дзеля дзяржавы асабліва важнае значэнне, якія могуць быць апублікаваны — астатнія будуць непасрэдна і выключна перадаваць ТАСС (Тэлеграф. Агенцтва Савецк. Саюза).

Нам.заг.Галоўлітбела (Гурскі)
Сакратар (Суднік)

N 31/С
2-га лістапада 1926 г. *Зус.сакрэтна —*
г.Менск *абежнік*

Усім заг. Акрлітаў і Палітрэдактарам газэт

За апошні час у прэсе сталі сустракацца паведамленні аб бандыцкіх наскоках.

Галоўлітбел катэгарычна прапануе ні ў якім разе не змяшчаць падобных вестак, які б яны характар не насілі, крымінальны ці палітычны, без адпаведнага ўзгаднення з мясцовымі органамі ДПУ, а ў Менску непасрэдна з Галоўлітам.

Загадчык Галоўлітбелу (Арэшнікаў)
Інспектар па справах друку (Гурскі)
Сакратар (Суднік)

N 4479/С Минск *Строго секретно*
ЦК КП(б)Белоруссии Срочно

Всем ЦК нацкомпартий, крайкомов и облбюро ЦК ВКП(б)

При освещении в печати Белоруссии урожая необходимо руководствоваться следующим.

Не подлежат опубликованию:

а) перспективы хлебо-фуражного баланса (в цифровых данных);

б) данные о предполагаемом валовом сборе хлебов по отдельным краям и районам;

в) перспективы хлебоэкспорта (в цифрах).

При оценке урожая в печати необходимо придерживаться только бальной системы.

В соответствии с этим различные сведения о состоянии посевов и ходе реализации урожая можно помещать в печати лишь в указанных выше пределах.

Срочно дайте соответствующие указания местным органам печати.

Секретарь ЦК ВКП(б) (В.Молотов)
Зав.отделом печати ЦК (С.Гусев)

Вх. N 260сс
19.VII.26 г.
N 62-с *Зус.сакрэтна*
4 снежня 1926 г.
г.Менск

Усім Акрлітам і Палітрэдактарам

Галоўлітбел прапануе Вам ні ў якім выпадку не дапушчаць у друку дыскусіі па пытанню аб дэвальвацыі чырвонца, а таксама не дазваляць друкаваць артыкулаў, заметак і інш., гаворачых у той ці іншай форме аб магчымасці ці пажаданні дэвальвацыі чырвонца.

Загадчык Галоўлітбела (Арэшнікаў)
Нам.сакратара (Сікорская)

РЫХТУЕЦЦА КАНФЕРЭНЦЫЯ

Беларускі навукова-даследчы цэнтр дакументазнаўства, археаграфіі і архіўнай справы і гістарычны факультэт Беларускага дзяржаўнага універсітэта плануюць правесці 15 лютага 1996 года навуковую канферэнцыю "М. Улашчык і праблемы беларускай гістарыяграфіі, крыніцазнаўства і археаграфіі (да 90-ых угодкаў вучонага)".

У аргкамітэт увайшлі М. Біч, Н. Гілевіч, А. Каўка, Г. Кісялёў, А. Ліс. У. Міхнюк (сустаршыня), Г. Сагановіч, В. Селяменеў, Г. Сурмач, В. Чамярыцкі (сустаршыня). П. Шуляк (сустаршыня), у рабочую групу — С. Жумар, А. Каханоўскі, П. Лойка, У. Ракашэвіч, В. Скалабан (кіраўнік).

На канферэнцыі будуць разгледжаны наступныя пытанні: "М. Улашчык — гісторык Беларусі. Яго жыццё, навуковая і грамадская дзейнасць", "Спадчына М. Улашчыка і праблемы беларускай гістарыяграфіі і крыніцазнаўстаа", "М. Улашчык — археограф. Стан і перспектывы беларускай археаграфіі", "Уклад М. Улашчыка ў гістарычнае краязнаўства Беларусі".

Заяўкі на ўдзел у канферэнцыі з указаннем тэм дакладаў і паведамленняў прымаюцца да 15 снежня 1995 года па адрасе: 220030, Мінск, вул. Кірава, 43, БелНДЦДААС.

Запрашэнні высылаюцца ў пачатку студзеня 1996 г.

Даклады і паведамленні, заслуханыя на канферэнцыі, будуць выдадзены асобным зборнікам.

Даведкі па тэлефонах: 29-32-85, 27-30-14, 26-01-75.

ЛІМ
ЧАСАПІС

УСПОМНІМ АЛЯКСЕЯ ПЫСІНА

Аляксей Васільевіч Пысін, цудоўнейшы чалавек і выдатны паэт, адзін з самых слынных майстроў беларускага паэтычнага слова... Тыя, хто сябраваў, ці проста сустракаўся з ім, могуць нямала расказаць пра яго, згадаўшы шмат якія выпадкі, што сведчаць аб пысінаўскай дабрані, душэўнай шчодрасці, незвычайнай сіле таленту, добразычлівым стаўленні да калег па пяры і заклапочаных адносінах да творчай моладзі.

А чаму б і не зрабіць гэта? Заадно сабраць і здымкі, на якіх занатаваны воблік дарагога і незабыўнага Аляксея Васільевіча...

Дасылайце, калі ласка, свае матэрыялы для кнігі ўспамінаў пра А.Пысіна яго дачцэ: 220004, г.Мінск, вуліца Калектарная, дом 15-а, к.55, Пысінай Галіне Аляксееўне.

НЕ ЗНІКЛІ ТАЛЕНТЫ

Часопіс "Маладосць" працягвае сваю даўнюю і добрую традыцыю, адкрываючы пісьменнікаў, якія жывуць на перыферыі. Пацвярджэнне таму і чарговая, дзевятая за сёлетні год кніжка яго "Бібліятэкі..." Ёй стаў зборнік паэзіі Галіны Варатынскай "З будзённасці ўзляцець..."

Вершы Г.Варатынскай (нарадзілася ў вёсцы Ваўчо Ушацкага раёна, скончыла факультэт журналістыкі Беларускага дзяржаўнага універсітэта, цяпер працуе ў рэдакцыі мясцовай раённай газеты "Патрыёт") дагэтуль друкавалася ў той жа "Маладосці", у "Чырвонай змене", "ЛіМе" і іншых перыядычных выданнях. Паэтэса прысвячае прачулыя радкі роднай Ушаччыне, раскрывае пачуцці і перажыванні лірычнай гераіні, задумваецца над вытокамі, з якіх пачынаецца беларускасць, адданасць Бацькаўшчыне. Пра ўсё гэта, дарагое і блізкае, — верш "Адвечнае", якім адкрываецца кніга:

Адвечнае не адыходзіць
у ланцуту сівых гадоў.
Яно з маім жыццём у згодзе
і паўтараецца наноў.

ПРА БЕЛАВЕЖЖА І НЕ ТОЛЬКІ...

Каго сёння здзівіш новым выданнем? З'яўляюцца яны нібы грыбы пасля цёплага дажджу. Здаецца, на ўсе густы і палітычныя сімпатыі. І ўсё-такі новая газета, пра якую мне хочацца сказаць колькі слоў, адметная.

Скажам адразу: яна не для аматараў "клубнічкі". Яна для тых, хто любіць, шануе каштоўнасці адвечныя — родную прыроду. І хоць назва газеты "Белавежская пушча", хай не збянтэжыць вас яе некаторая, так бы мовіць, геаграфічная лакальнасць.

Вызначаючы яе накірунак, стратэгічную лінію, заснавальнік і рэдактар новай газеты Валерый Дранчук у сваёй адозве да чытачоў піша: "Будзем славіць прыродную красу і біялагічную разнастайнасць Беларусі на яскравым прыкладзе Белавежскай пушчы, іншых нерушаў ды ацалелых мясцін Бацькаўшчыны. Будзем папулярызаваць экалагічныя ісціны, веды аб роднай прыродзе".

Практычна ўвесь першы нумар "Белавежскай пушчы" прысвечаны гэтаму выдатнаму і знакамітаму кутку прыроды Беларусі. Пачынаючы ад экскурсаў у яго гісторыю (рэтра-анонс з пералікам найбольш вядомых старонак "біяграфіі" пушчы, першае ўпамінанне аб якой прыпадае на 983 год у Іпацьеўскім летапісе) і канчаючы матэрыяламі, што прысвечаны сучаснаму жыццю пушчы.

Багата ў нумары матэрыялаў чыста пазнавальнага характару аб флоры і фаўне пушчы, якая ў многіх з нас асацыіруецца, прынамсі, з магутным белавежскім зубрам. Думаю, зацікавіць чытача і досыць нечаканая на старонках такога спецыфічнага выдання публікацыя раздзела Статута Вялікага княства Літоўскага 1588 года. Але, з другога боку, раздзел гэты, пры бліжэйшым знаёмстве, аказваецца, мае хоць і ў гістарычнай рэтраспекцыі, дачыненне да ўзаемаадносін чалавека і прыроды. Зрэшты, ён так і называецца: "О пущах, о ловах, о бортном дереве, об озерах и лугах".

Друкуецца ў нумары і ўрывак з кнігі "Геаграфія Беларусі" аднаго з найруплівейшых самаахвярных дойлідаў беларускай дзяржаўнасці, расстралянага ў 1938 годзе ў Омскай турме Аркадзя Смоліча. Застаецца дадаць, што першы нумар "Белавежскай пушчы" вельмі багата ілюстраваны. Сярод аўтараў здымкаў — і вядомы фотамайстар Ян Ежы Карпінскі, які ў свой час шмат зрабіў для захавання, папулярызацыі пушчы.

Ну, што ж, заяўка новага выдання зроблена. Будзем чакаць наступных нумароў.

М.З.

"Я — ТОЙ, ХТО ШЛЯХ І ХТО ПА ІМ ІДЗЕ..."

ГУТАРКА З АЛЕСЕМ РАЗАНАВЫМ

— Алесь Сцяпанавіч, ваш новы зборнік "Паляванне ў райскай даліне", які склалі версэты, пункціры, вершаказы, заканчваецца раздзелам дасюль не зведанага жанру — зномы. З вашай згоды я працытую апошні, які завяршае кнігу: "Чалавек мысліць тою сваёй іпастассю, якая і сама яшчэ творыцца. Таму і магчыма, таму і мае сэнс творчасць, што разам з задуманым творам дзейсніцца яшчэ адзін твор — творца". У дадзеным выпадку, мне здаецца, "дзейсніцца" не толькі наша з вамі гутарка, але і дыялог з чытачом. Вам першае пытанне: тварэнне творцы ў выпадку творчасці як адчуваецца самім творцам?

— Адчуваецца як працэс і як вынік працэсу. Канечне, гэтыя з'явы: і працэс, і вынік — яны не канчатковыя. Але яны выяўляюць пэўны час і пэўны перыяд у творчасці аўтара. На маю думку, у параўнанні з папярэднімі зборнікамі я ў гэтай кнізе найбольш гарманічна ўвасобіўся. Тут ёсць, як вы ўжо згадвалі, раздзелы і, адпаведна, модуль кнігі своеасаблівы, ён складваецца з пластоў: версэты, паэмы, пункціры, вершаказы, зномы і перастварэнні з Веліміра Хлебнікава, паэта, які з'яўляецца своеасаблівым творцам творцаў, і сваёй творчасцю заклікае да творчага супражэння, спаборніцтва. А назва кнігі "Паляванне ў райскай даліне" абумоўлена і прадыктавана назвай версэта, з якога пачынаецца зборнік.

— А калі згадаць ваш першы зборнік "Адраджэнне" і адзін з наступных, што называўся "Каардынаты быцця", то па асацыяцыі з назвамі кніг прамежак часу паміж "Адраджэннем" і "Паляваннем у райскай даліне" якія "каардынаты быцця" вызначыў у творчасці паэта Разанава?

— Ведаеце, ёсць з'явы, якія спасцігаюцца дакладнымі навукамі: матэматыкай, фізікай, хіміяй. Паэзія, на маю думку, гэта не проста прыгожае пісьменства, яна таксама спасцігае з'явы, якія нічым іншым, ніякай іншай навукай нельга "памацаць" і ўгледзець. І гэтая тонкая рэчаіснасць не зводзіцца да відавочных з'яў, да відавочных прадметаў. Яна ўключае ў сябе нябачныя вымярэнні. Паэзія мае справу якраз з гэтым нябачным вымярэннем. Тут, вядома, калі гаворка ідзе аб паэзіі, заўсёды маецца на ўвазе чалавек. І чалавек-творца і чалавек у прынцыпе. Таму што першай і апошняй мэтай паэзіі і з'яўляецца сам чалавек, яго магчымасці. І, безумоўна, уся справа ў рэалізацыі гэтых магчымасцей, у адкрыцці такіх цэнтраў — патаемных, сакрэтных, невідавочных, якія закладзены ў чалавеку. Паэзія ідзе як бы ад гэтага: ад немагчымасці.

Калісьці Уолт Уітмен, амерыканскі паэт, сказаў, што ад паэзіі нічога нельга схаваць. Нават тое, што ты раніцай рабіў, чым снедаў — гэта таксама адаб'ецца на тваім вершы. Паэзія гэта адчуе і выдасць. Апроч тых назваў, якія вы згадвалі, у мяне яшчэ быў "Шлях 360"...

— Таксама вельмі асацыятыўная назва!

—. Так, і, ведаеце, шлях, мусіць, адрозніваецца ад дарогі тым, што дарога як бы ўжо з самага пачатку да канца прадвызначаная. Яна ўжо адбылася аднойчы ў рэчаіснасці, у свеце — і вось яна доўжыцца, і паўтарае самую сябе. Шлях — гэта кожны раз жывая дарога. Яна адчувае чалавека, яна разумее яго. Я калісьці сфармуляваў у адной сваёй паэме, што я — той, хто шлях і хто па ім ідзе. Адначасова шлях як бы ўбірае тое, што было ўчора і кожны новы дзень. Ён гэтаму шляху дазваляе ісці і адбывацца непаўторна. І калі асабовы шлях у дачыненні да канкрэтнай асобы застаецца ў значнай меры прыватным шляхам, прыватнай дарогай, то шлях творцы, шлях паэта — ізноў-такі ў пэўнай меры, у пэўнай ступені — гэта шлях самой рэчаіснасці.

— Сёння ў беларускай паэзіі існуе такое паняцце, як аўтарскія жанры паэта Алеся Разанава. Алесь Сцяпанавіч, дзе, скажыце, тая крыніца адчування вамі літаратурнай формы? Гэта прастора ўжо дастаткова распрацаваная ці кожны раз — новае адкрыццё і свой моўны пошук?

— Кожны твор у прынцыпе — гэта адкрыццё. Я ва ўсялякім разе не прыхільнік колькаснага нарошчвання вершаў. Мне цікава расці, мне цікава адкрываць. І калі кожны верш — адкрыццё, то, мабыць, яшчэ большае адкрыццё, калі адкрываецца нейкі жанр. Калі ўпершыню пачалі падступацца версэты — я яшчэ ніводнага слова з іх не ведаў. Але форма пачала акрэслівацца. Я доўга эксперыментаваў, звужаў, пашыраў, дзяліў на пэўныя рады, але спачатку прыйшло адчуванне формы. І потым яна стала напаўняцца канкрэтыкай. Але асноўнае ўжо адбылося, асноўнае — адкрылася форма. І гэтая форма ўжо як своеасаблівая хваля — ну вось ёсць радыёхвалі, і на іх агучваюцца менавіта такія рэчы, такія думкі, такія настроі, такія вобразы. А ў кнізе прысутнічае, можна сказаць, некалькі такіх хваляў, некалькі дыяпазонаў. У межах іншага дыяпазона версэт не адбудзецца. Адбудзецца вершаказ, адбудзецца зном, адбудзецца паэма, пункцір — кожны жанр валодае пэўным сваім перыядам, пэўнай частатой, пэўнай хваляй.

— Цікава, дзе тая мяжа, на якой аўтар адчувае розніцу жанраў?

— А я тут ужо дазваляю самому вершу, каб ён гаварыў за сябе, каб ён адбываўся. Калі ён адбываецца, ён сам ведае, куды яму ісці, куды яму цячы. Калі ён заўпарціцца і не захоча адбывацца, я нічога не змагу зрабіць, колькі б ні сядзеў за сталом: дзень ці два. І таму заўсёды творчасць — гэта пэўным чынам супрацоўніцтва. У ім два пачаткі: аўтар, які арганізуе твор, і той самы твор, які — магчыма, тут трошкі метафізікі — загадзя прысутнічае, і ён захоча адгукнуцца на тваю прапанову, на тваё слова. А калі захоча, то трэба слухацца, што ён табе гаворыць, што ён хоча сказаць, як ён хоча ўвасобіцца.

— Алесь Сцяпанавіч, можна сказаць, цаглінкамі ўсіх літаратурных форм з'яўляецца слова. Цікава, хто з вас вядучы, а хто вядзёны?

— Яшчэ раз — гэта ўзаемны працэс, двухісны. Па-першае, каб пачаць пісаць верш, трэба ўжо каб была нейкая нота, водгук, імкненне. Калі гэтага няма, то, значыць, няма той матэрыі, з якой можна працаваць. Але калі ты злавіў слова, атрымаў водгук з прасторы — ты ўжо ў межах пэўнага жанру. Ты творыш верш, але пастаянна ўдакладняеш гэты свой верш з тым самым узорам, скажам так, архетыпам, які даў табе гэты водгук.

— Вы сказалі, што кніга "Паляванне ў райскай даліне", пра якую ідзе ў нас з вамі гаворка, найбольш поўна прадстаўляе вас як аўтара розных літаратурных форм. Як вы лічыце, спалучэнне усіх гэтых форм і пераход унутранага аўтарскага адчування ў іх мае пэўнае суадносінне з часам, з падзеямі? Проста з нейкім камічным, калі хочаце, станам творцы?

— Я думаю, што рэчаіснасць — яна адзіная, але ў залежнасці ад чалавека, ад яго настрою, ад яго "зараджанасці" — яна можа адгукацца або адным, або другім сваім бокам, пэўнай сваёй нотай. Рэчаіснасць універсальная, у ёй прысутнічае адразу ўсё. Яна дазваляе чалавеку гаварыць так, як здолее чалавек. І мне цікавая размова з рэчаіснасцю ва ўсіх планах, ва ўсіх іпастасях. Чалавечае жыццё ў нечым вельмі адноснае, вельмі ўмоўнае, але якраз у гэтай умоўнасці і ствараецца такі непераўзыдзены глыбокі сэнс, які, можа, і з'яўляецца злепкам самой рэчаіснасці. І гэта самае каштоўнае ўрэшце, што чалавек можа набыць.

— На маю думку, рэчаіснасць, у якой знаходзіцца творца, пэўным чынам пераўтвараецца ім у прастору моўную, у прастору гукавую. Пытанне такое: адчуванне слова, адчуванне гуку — як выяўляе гэту рэчаіснасць?

— Па-мойму, творцы, паэта няма без адчування слова, без адчування гуку. У паэзіі гук — не проста гук, ён становіцца гукасэнсам. І сфера гукасэнсу яшчэ не вельмі намі абазнана, не спазнана. Мы ў ёй рухаемся, паводзімся, знаходзім сябе навобмацак. Але нават у такім побытавым штодзённым жыцці мы ўсё ж такі адрозніваем сэнс аднаго гуку ад сэнсу, які нясе, дапусцім, блізкі гук, але ўсё ж не той самы.

Звярніце ўвагу, калі немаўлятам даюць імёны, як людзі перабіраюць гэтыя імёны і кажуць: вось гэтае пасуе, гэтае не пасуе, хаця імёны могуць быць вельмі блізкія або разнавіднасцю аднаго і таго ж урэшце кораня. У гуку закладзены ўжо сэнс. Азінае, што мы яшчэ як бы не адчуваем, не разумеем, які сэнс там закладзены. Вось нават і маё імя: Алесь, Аляксандр, Саня, Шура, Саша — урэшце адно і тое ж імя, але кожнае слова нясе ўсё ж такі розную сэнсавую нагрузку і інфармацыю на ўзроўні інтуіцыі. І нездарма кажуць, што сусветы ў касмагоніі тварыліся гукам, вібрацыяй. Спачатку было слова.

Я ў сваёй творчасці гуку надаю вялікую ўвагу. І менавіта з увагі да гуку, з патрэбы гуку стаць сэнсам, відаць, і ўзніклі такія мае аўтарскія жанры, як квантэмы і як вершаказы. Напрыклад, квантэма, якая гучыць так (у ёй гульня на гуках, але гукі якраз становяцца гукасэнсамі): "Руіны запарушваюцца. Рунь уваскрашае руны. Неба блізка". Унутры вызначаных рытмаў, а мы ведаем гэтыя рыфмы па падручніках са школьных яшчэ гадоў: ямб, харэй, дактыль, амфібрахій, анапест — існуюць больш тонкія рытмы. І гэтыя рытмы спалучаны якраз з чалавечым голасам, з чалавечай інтанацыяй. Таму што адным і тым самым рытмам, нават калі і складоў будзе аднолькавая колькасць, у радку можна апісаць зусім розныя рэчы. Але адметнасць гэтым рэчам, гэтым творам надае якраз глыбокі рытм, спалучаны з голасам, з інтанацыяй. І ў вершы важны не сам па сабе рытм, а якраз інтанацыя рытму, колер рытму, я сказаў бы. Вершы, мабыць, і ўзнікаюць як патрэба гэтай інтанацыі прабіцца, выявіцца, сказаць пра сябе. Тут варта яшчэ назваць уголас слова, якое прысутнічае ў маіх развагах — гэта ўжо пачуццё, але пачуццё, якое думае, разумее. Гэта проста, мабыць, новы стан творчага мыслення.

А што да гукавой прасторы, то, на маю думку, яна і ёсць мова. Тысячагоддзямі людзі, шматлікія пакаленні ў мову ўкладалі ўсё сваё жыццё, укладаліся самі. І ў гэты палетак укладаецца ўся зямля і ўсё неба. Укладаецца космас. І, паверце, што ў космасе маюць вартасць не толькі нейкія новыя з'явы, новыя думкі, але важны і тыя асновы, якія напрацоўваліся за гэтыя тысячагоддзі. Космас жывы, і ён зацікаўлены ў беларускай мове.

— У высокафіласофскай паэзіі Разанава як дапамагае аўтару адчуванне філасофіі гуку? Гуку, як першай прыступкі да ўсёй паэтычнай прасторы, калі хочаце...

— Якраз у падаснове прыгожага пісьменства і знаходзіцца гук. Гэта, як, скажам, карані ў дрэва. Гук — гэта карані. А карані не любяць, каб іх мацалі, краталі, каб іх раскопвалі, выводзілі на святло — пакіньце ў спакоі карані, там, дзе яны знаходзяцца — у цемры. Бо карані і самі выяўляюцца. Якім чынам? Праз тое ж самае дрэва: праз ствол, праз галіны, праз зялёнае лісце, праз кветкі. І калі кветка цвіце, то якраз тут і шукайце філасофію гэтых самых каранёў. І калі адбываецца твор, якраз у творы шукайце філасофію гуку. Ён, гук, прысутнічае вось такім апасродкаваным чынам. Але таму, што твор узнікае, што твор з'яўляецца — у гэтым якраз такая анталагічная філасофія гуку і праяўляецца, і прысутнічае.

— Алесь Сцяпанавіч, такія мініяцюрныя формы, як пункціры, што складаюць цэлы раздзел у новым зборніку "Паляванне ў райскай даліне", чым прываблiваюць вас як паэта? У чым іх хараставо, іх асалода для творцы?

— Пункціры — гэта назіранне, думка, вобраз — тое, што заўважылася вакол сябе ў рэчаіснасці. Што пастукалася ў тваю душу, у свядомасць, што блізка падступілася. І трэба, каб зрок убачыў, а слых пачуў нешта істотнае, каб быў гатовы гэта успрыняць. Калі прыйдзе такое назіранне — тады яно можа стаць пункцірам.

Пункцір — гэта 3, 4, 5, ну 6 радкоў ад сілы. Але ён, канечне, валодае ўнутранай цэласнасцю і, мне думаецца, што маленечкі па аб'ёме пункцір па сутнасці сваёй нават большы, чым паэма або верш. Я недзе казаў пра гэта ці нават пісаў у зномах, што, калі верш — гэта як колас, як рунь, сцябліна, то пункцір — гэта зернейка. І калі паэма — цэлы колас, то ўсё ж такі адно зернейка — яно больш блізкае, або сугучнае, або больш адпаведнае коласу, чым сама саломінка, сама сцябліна. І таму, мне думаецца, што нейкім чынам пункціры нагадваюць мікрапаэмы.

— І, можа быць, пункціры, складваючы гэту паэтычную аўтарскую мазаіку, аздабляюць яе пэўнымі іскрынкамі думак, настрою і ствараюць ледзь прыкметныя вехі творчай дарогі мастака?

— Безумоўна. Безумоўна, якраз гэтыя пункціры і заўважаюцца на дарозе. Седзячы дома, іх не напішаш. Трэба быць у дарозе, каб заўважыць тое, што адбываецца на дарозе.

— Гэта ёсць дыханне жыцця рэальнага?

— Так, рэальнага, таму што кожны чалавек непазбежна сустракаецца вось з гэтай матэрыяй. І яна яму блізкая, можа, як ніякая іншая.

— Я, зрэшты, хачу сказаць, што пункціры хораша прачытваюцца з вершаказамі. Чытач можа згадаць зараз папярэдні ваш зборнік...

— Маецца на ўвазе "У горадзе валадарыць Рагвалод"?

— Так, гэту кнігу склалі менавіта вершаказы і пункціры. І форма вершаказа на той час была прынята як адкрыццё, таму што ў беларускай паэзіі такога жанру раней не сустракалася. У зборнік "Паляванне ў райскай даліне" вы таксама ўключылі цэлы раздзел вершаказаў. Здавалася б: гэта форма вамі ўжо адпрацавана, ужо спазнаны вамі яе гук, музыка, мелодыка — і гэтае адчуванне, як вы любіце казаць, рэчаіснасці, бо ў вершаказах таксама побытавая аснова, у вершаказ уплятаюцца абсалютна рэальныя нейкія рэчы — ці стан прыроды, ці адчуванне чалавека. То сёння на дарозе вершаказа што вам яшчэ сустракаецца?

— На гэтай дарозе сустракаюцца самі вершаказы. Таму што, я думаю, з вершаказамі не так усё проста: напісаў некалькі, паказаў, што яны ёсць, і досыць. Тут прадбачыцца цэлы пласт, цэлая з'ява. Па сутнасці, вершаказы — своеасаблівы эпас, мазаіка эпасу. Эпасу трохі незвычайнага, які спалучаны якраз з побытам, у першую чаргу з сялянскім, з усім нашым наваколлем. У гэтым наваколлі ёсць шмат з'яў, прадметаў. І кожны прадмет, кожная з'ява, якая мае сваю назву, сваё слова, сваё паняцце — яны па сутнасці хочуць агучыцца, яны хочуць расказаць пра сябе. Я ім даю магчымасць — яны расказваюць пра сябе. А мне застаецца толькі быць вельмі пільным і не сапсаваць гэтага расказу, гэтага апавядання. Можна сказаць, што ў вершаказах я вынайшаў нейкі свой спосаб рыфмоўкі, такую рыфму, якую я сам называю дамінантнай. Дамінантная рыфма — гэта тое імя, тая назва, якія маюць рэч, прадмет, з'ява. І ўвесь вершаказ падпарадкоўваецца, слухаецца гэтага ключавога слова. Ці гэта збан, ці грыб, ці павуціна, ці гузік, ці дуга, ці дзіда і г. д.

У слове заўсёды прысутнічае таямніца. У ім закадзіравана нешта вельмі істотнае, цэлы пласт рэчаіснасці. Вершаказы па меры магчымасці расшыфроўваюць гэты код, дазваляюць слову, каб яно расказала, з кім яно сябруе, як яно адчувае іншыя словы. І, дарэчы, не толькі ў межах адной мовы, беларускай. Часам вершаказы выходзяць на такія памежжы, дзе пачынаюць адгукацца блізкія словы з іншых моў. Але хоць словы і вельмі блізкія па гучанні, а па сэнсе і зусім як бы тыя самыя, тым не менш, у кожнага слова ў сваёй мове ёсць свая розніца. І паколькі гэтае слова ў сваёй мове — гэта розніца адчуваецца і назапашваецца.

— А ўзаемадзеянне атрымліваецца?

— Безумоўна, атрымліваецца. Таму што гэта пэўным чынам як родзічы, як сваякі, якія апынуліся ў розных краях, ужыліся ў свае абставіны, краявіды, у сваё наваколле, але, аднак жа, яны адзін аднаго пазнаюць здалёк.

— Алесь Сцяпанавіч, калі вершаказ мае такую унікальную здольнасць вырастаць з побытавага, а Уолт Уітмен сцвярджаў (як вы згадвалі на пачатку гаворкі), што нават меню снедання паэта абавязкова адаб'ецца на яго вершы, а Ганна Ахматава ў свой час пісала: "Когда б вы знали, из какого сора растут стихи, не ведая стыда", то як сутыкаюцца, на вашу думку, высокае і паўсядзённае ў мажлівасцях паэзіі, мастацкага слова?

— У старажытнага мудраца Гермеса Трысмігіста ў яго "Смарагдавай скрыжалі" ёсць такое азначэнне: "Тое, што ўнізе, падобна таму, што ўверсе. А тое, што ўверсе, падобна таму, што ўнізе". Урэшце, рэчаіснасць адзіная. І няма рэзкага размежавання паміж тым, што ўверсе і што ўнізе. І як толькі хтонебудзь хоча, каб гэта мяжа рэзка ўсталявалася — тут адбываецца вялікая трагедыя. Адбываецца вялікае неразуменне. І трэба тады космасу, прыродзе прыкладваць свае намаганні, каб зноў усталявалася тая ўнутраная раўнавага, дынамічная раўнавага, якая заўсёды існуе паміж высокім і нізкім. І якраз у побытавым (а побытавае, дарэчы, я не зводжу да нізкага, якраз у побытавым сустракаецца высокае і нізкае). Там і цэласныя натуры, і цвітуць душы, і людзі даюць імёны рэчам. Згадайце, усе ўспаміны з маленства звязаны якраз з побытавым.

Але таму, што гэтае побытавае асветлена такім непаўторным каляровым святлом — яно становіцца...

— Самым высокім.

— Яно становіцца быційным. У сваёй творчасці я таксама напачатку, як на маю думку, зрабіў моцны рывок з побытавага. Ну, скажам, у рамантычнае. Але, калі набылася адлегласць, дзякуючы гэтаму самаму рыўку, то і побытавае пераарганізавалася, стала ўспрымацца па-іншаму. Ёсць у мяне паэмы, якія называюцца "Паэма рыбіны", "Паэмы сланечніка", "Паэма палявання" — яны створаны на побытавай матэрыі, на матэрыі лёсу, таму што і лёс адбываецца якраз у звычайнай рэчаіснасці, у побыце. Ёсць і вершаказы, пра якія мы ўжо з вамі гаварылі, і з іх творыцца нешта, што прысутнічае толькі ў побыце. Але галоўнае, што ў гэтым самым побытавым адбываецца і дзейсніцца чалавек. Ён нідзе не можа адбыцца: ні ў самым высокім, ні ў самым нізкім — ён адбываецца якраз у побытавым.

— Алесь Сцяпанавіч, а чаму вы звярнуліся як перакладчык да паэзіі Хлебнікава? Што роднаснае, сугучнае вам, знайшлося ў яго паэтыцы? Чаму захацелася адчуць той гук і перавесці хлебнікаўскую мелодыю ў беларускае слова?

— Я думаю, тут трэба ўдакладніць. Можа, гэта не зусім пераклады. Бо ёсць жа ў перакладчыцкай практыцы такія формы, якія называюцца наследаванні, перастварэнні або нават "з". Я пазначыў публікацыі з Хлебнікава словам "з". Лічыце, што "з" — таксама своеасаблівы жанр. Што да Хлебнікава, то, ведаеце, ён такі паэт, якога нават перакладаць немагчыма. Ён становіцца проста прапановай для сутворчасці. Кажуць пра перакладчыка прозы, што ён раб, пра перакладчыка паэзіі — што ён заўсёды спаборнік з аўтарам. То якраз Хлебнікаў дае такую магчымасць вельмі-вельмі паспаборнічаць з ім. І, карыстаючыся зноў жа яго вершам, яго модулем, у сваёй мове стварыць нешта адэкватнае, актывізаваць яе паводле тых прынцыпаў, законаў, якія прапануе верш Хлебнікава.

— Алесь Сцяпанавіч, мне хочацца зараз перайсці да апошняга раздзела кнігі "Паляванне ў райскай даліне". Ён пазначаны вамі як "Зномы".

— Мы і пачалі нашу гаворку, здаецца, з гэтага раздзела?

— Так, бо мне падалося, што тэму нашай сённяшняй размовы можа акрэсліць той зном, якім заканчваецца ваш зборнік (я згадвала яго напачатку). Новы аўтарскі жанр, што дае афарыстычнае тлумачэнне той ці іншай мастацкай з'яве, нават самому працэсу творчасці, — калі пастукаўся ў вашы, так бы мовіць, паэтычныя дзверы? Гэта пэўная рэакцыя на сённяшняе літаратурнае жыццё альбо інтуітыўнае прачытанне твора мастацтва паэтам-крытыкам?

— Калі ў дачыненні да іншых жанраў можна казаць, што гэта паэзія філасофская, дык у дачыненні да зномаў, відаць, у першую чаргу выпадае сказаць, што ўсё ж такі гэта філасофія, але філасофія паэтычная. Тут жыве і вобраз, жыве і інтанацыя, жыве і гук. Зномы напачатку не мелі гэтакай назвы, ішлі як нататкі, нават як філасафемы. Зномы з'явіліся ўжо ў апошні час, калі рыхтавалася кніжка. З'явіўся адзін такі зном-назіранне, дзе я і гавару якраз пра такую з'яву, як зно. Зно —як мысліцельная рэчаіснасць. Дарэчы, потым у газеце "Культура" такі сшытак з'явіўся літаратурна-філасофскі, і слова зно туды перавандравала. Дык калі я толькі пачаў аб'яўляць зномы (а гэта канец 70-ых гадоў), то мне казалі, ну навошта сціскаць літаральна ў адзін абзац тое, што можна разгарнуць у цэлы артыкул? А мне быў цікавы якраз адваротны працэс, каб думка, якая рассейваецца, разгортваецца на цэлы артыкул, каб яна сціснулася і прысутнічала амаль у якасці афарызму. Цікавай была гэта квінтэсенцыя. Тут, канечне, зноў мы сціснутыя, але якраз з гэтай сціласці і вынікае новая якасць.

Зномы значнае месца займаюць у кніжцы. Гэта ледзь не своеасаблівая кніжка ў кніжцы. Але яны назбіраліся з году ў год, і пытанняў не паўставала, ці рыхтаваць нешта асобнае, ці ўключыць у кантэкст іншых паэтычных жанраў. Я яшчэ раз пагартаў, паглядзеў і адчуў, што ўсё ж такі яны прыналежаць не толькі філасофіі, не толькі крытыцы, не толькі літаратуразнаўству, але і паэзіі, і я далучыў іх да чыста паэтычных жанраў.

— Яны сталі вельмі цікавым дапаўненнем да астатніх раздзелаў, нават пэўным падсумаваннем гэтага выдання. Мусіць, у гэтым і ёсць своеасаблівасць творцы, калі ён здольны спалучыць абсалютна розныя, на першы погляд, жанры, якія ў судзеянні набываюць новыя рысы і яшчэ больш высвечваюцца, як шматграннік, сваімі гранямі. У залежнасці ад таго, як падае праменьчык святла на іх, яны і даюць нам свой знак: сваё цяпло або, наадварот, халоднае рацыю, якое, дарэчы, усё роўна звязана з чалавечай цеплынёй. Алесь Сцяпанавіч, а што яшчэ можна ўгледзець на распрацаваным даляглядзе "Літаратурныя формы Разанава"?

— У свой час крытык Анатоль Сідарэвіч казаў, што ў беларускай паэзіі Разанаў сам накірунак і сам школа. Канечне, да зномаў, калі карыстацца гэтай тэрміналогіяй, хутчэй адносіцца слова "школа". Гэта было ў той час, калі я распачынаў свой паход на засваенне новых паэтычных абсягаў. Я думаю, што гэты паход доўжыцца. Ён будзе доўжыцца, таму што недзе закладзены ў душы той няўрымслівы ген, які не хоча працаваць на колькасць, яму трэба нешта адкрываць, казаць тое, што дагэтуль не казалася.

І ў "Мастацкую літаратуру" здадзены рукапіс новай кнігі, якая мае назву "Рэчаіснасць". Там будуць тыя самыя жанры, пра якія мы і сёння гаварылі, але будзе, можа, эксперыментальны, а можа, нават і дужа-дужа традыцыйны жанр: ён мае назву ўмоўную — узнаўленні. Я звярнуўся да нашай гісторыі, да гісторыі беларускай літаратуры і паглядзеў, якія мы бедныя і ў той жа час — багатыя. Бедныя таму, што не актывізавалі некаторыя пласты, якія засталіся ў гісторыі. А багатыя таму, што там столькі многа ўсяго, такое ёсць, што калі б гэта актывізавалася, увайшло ў сённяшні дзень, то, відаць, усе суседзі сказалі б, што беларуская літаратура — адна з самых багатых у Еўропе.

Я звярнуўся да тэкстаў, да постаццяў старажытных аўтараў. Яны тады не пісалі, канечне, так, як пішам мы цяпер, але тым не менш у іхняй сінкрэтычнай мове — ці гэта прадмова да нейкай кнігі, ці гэта слова святарскае, як казанне, як пропаведзь — у іхняй мове, вельмі насычанай, вобразнай, ужо прысутнічае паэзія. Мая роля была як бы ўзнавіць тое, што стваралася тады, сродкамі сучаснай беларускай мовы. Зрабіць пэўную рэстаўрацыю. Таму што тыя тэксты красамоўныя і даступныя толькі невялікаму колу даследчыкаў, знаўцаў. Мяняецца не толькі час, не толькі жанр, літаратура, але і сама мова. Тая мова, якая была арганічная і ўласцівая таму далёкаму часу, цяпер ужо становіцца амаль няўцямнай. Такі вось дыялог.

У спадчыне заўсёды існуюць два пачаткі: колішні, калі чалавек нешта зрабіў, сказаў, напісаў — і цяперашні, калі нас з вамі сучаснік слухае, разумее, актывізоўвае той пачатак, той тэкст, тую постаць. Без гэтага другога полюса, без актыўнага цяперашняга пачатку і спадчына немагчыма. Яна ператвараецца ў суму музейных экспанатаў, мы мелі яшчэ і высокую паэзію, літаратуру. І таму ёсць у будучай кнізе цэлыя пласты гэтых узнаўленняў: і Кірыла Тураўскі, і Францішак Скарына, і Мялецій Смятрыцкі, і Васіль Цяпінскі і інш., якія гучаць як нашы сучаснікі.

— Жывая паэзія, якая ідзе ў сённяшні дзень і звязвае чытача, увогуле нашага сучасніка з гісторыяй, з мінуўшчынай.

— І, мяркуючы па тых тэкстах, можна сказаць, што ў нас ёсць і высокая тэалогія і глыбокая паэзія.

— Гэта цікава. Тады яшчэ ў працяг пытанне: гістарычная мажлівасць паэзіі і гістарычнае ў паэзіі?

— Хоць гісторыя адзіная, але кожны чалавек, і творца ў тым ліку (а можа, найперш ён), усталёўвае з гісторыяй свой дыялог. Абжывае па-свойму, актывізуе ў ёй тыя пласты, якія яму найбліжэй, кліча з гісторыі тыя постаці, якія яму зараз нешта кажуць. Нават у сучаснасці, цяпер, у сённяшнім дні ў нас ёсць зноў-такі свае знаёмствы, свае адносіны да людзей, ёсць свая ўлюбёная тапаграфія. І гісторыя зноў-такі чалавекам успрымаецца і клічацца праз прызму сучаснасці, праз прызму таго, хто ён ёсць цяпер.

Мае гутаркі з гісторыяй ужо таксама маюць сваю гісторыю. У колішнія часы гэта былі вершы: і "Арышт Кастуся Каліноўскага", і "Папярэджанне", дзе паўставаў вобраз Ефрасінні Полацкай. Цяпер гэта згаданыя вышэй узнаўленні, а нядаўна з'явілася новая рэч — паэма "Усяслаў Чарадзей", яна друкавалася ў часопісе "Крыніца".

Увогуле я скажу, што, мабыць, у апошнія часы, у найбольш такія інтэнсіўныя часы з жыцця нашага грамадства мяняецца кантэкст гісторыі, нават мера кантэксту гэтай самай гісторыі. Што да мяне, дык я раптам пачаў пачувацца, што я жыхар Вялікага княства Літоўскага.

— Цудоўнае пачуванне!

— І гэтае адчуванне дапамагае мне ўваходзіць, скажам, у кантэксты іншых народаў як свайму чалавеку. Проста жыхар Беларусі — я не маю ўваходу ў тыя самыя кантэксты. У Еўропе і па-за межамі яе мяне вельмі кепска ведаюць, амаль не ведаюць. Але калі я станаўлюся жыхаром Вялікага княства Літоўскага, я папросту ўваходжу ў Еўропу і мяне там, так сказаць...

— Прымаюць як свайго.

— Прымаюць і ведаюць. Гэта трошкі жарт, але ў гэтым жарце ёсць, канечне, доля праўды і свой сур'ёз. Нам трэба ствараць яшчэ асновы. Скажам, тая ж літаратура. Гавораць, гэта працэс, рэчышча. Але калі яшчэ не створаны асновы, то гэты працэс можа апынацца такім хісткім і ўвогуле аказацца пад пагрозай. Я што маю на ўвазе? Павінны быць актывізаваны, створаны, дастворaны, а можа і пераствораны некаторыя асновы, з якімі сама ідэнтыфікуецца народ, народная свядомасць. І тут яшчэ мы маем вялікую патрэбу і ў гістарычных творах, і ў сваім эпасе. Эпас таксама бывае вельмі розны. Ён можа быць створаны і на аснове гістарычных падзей, і на аснове фальклору. А ўрэшце эпасам можа быць і ўзноўленая сума тых самых твораў, пісьмовых твораў, якія ў нас ужо ёсць, але якія ляжаць у нашых запасніках, у нашай спадчыне. Вось калі будуць створаны гэтыя асновы, тады пагрозы нацыянальнаму існаванню, відаць, не будзе. Яна не пасмее падступіцца тады да народа.

— Пытанне апошняе. Алесь Сцяпанавіч. На пачатку нашай размовы вы казалі, што творца заўсёды на пэўным шляху, што менавіта шлях вызначае яго жыццё, яго сутнасць. У такім разе, вы — як падарожнік гэтага шляху — як сёння сябе пачуваеце?

— Яшчэ раз: адрозненне шляху ад усталяванай дарогі, якую можна вызначыць і планаваць далёка наперад, у тым, што шлях — гэта заўсёды жывы дыялог. Жывы дыялог з тымі самымі рэаліямі рэчаіснасці з тым самым сённяшнім днём, які заўсёды нечым адрозніваецца ад учарашняга, ад папярэдняга. Я дазваляю... Дазваляю, каб гэты дыялог адбыўся. І не хачу глушыць тыя самыя тонкія галасы, якія ўваходзяць у гэты дыялог, у гэту размову. Бо калі я сваёй воляй, сваім голасам нешта вызначу або прадвызначу — тыя тонкія галасы і тыя самыя тонкія сферы скажуць: ну а навошта тады мы? А паэзія якраз мае справу з рэчаіснасцю ва ўсім яе маштабе. І тонкая рэчаіснасць там займае вельмі і вельмі істотнае месца.

— Хай доўжыцца ваш шлях, і дзякуй вялікі за гэтую гутарку.

Гутарыла Галіна ШАБЛІНСКАЯ

ЛІМ
ЧАСАПІС

ВЕРНАСЦЬ ТРАДЫЦЫЯМ

Выдавецтва "Полымя" — адзінае ў нашай краіне з дзяржаўных выдавецкіх структур, якое асабліва вялікую ўвагу надае краязнаўчай, гісторыка-адраджэнскай літаратуры і для выпуску гэтых кніг мае нават спецыяльную рэдакцыю літаратуры па краязнаўстве. Як пераконвае тэматычны план выпуску літаратуры на 1996 год, у гэтым накірунку "Полымя" мае намер працаваць і ў далейшым. Запланавана шэраг кніг, якія, несумненна, зацікавяць кожнага, каму дорага нацыянальная мінуўшчына, хто хоча лепей ведаць свой край, пазнаёміцца з выдатнымі людзьмі Беларусі.

Папулярныя нарысы, са старонак якіх ажываюць асобныя моманты нашай багатай гісторыі, склалі кнігу С.Асіноўскага "Там, дзе была Няўрыда". Аўтар, які апошнім часам хораша зарэкамендаваў сябе рупным даследчыкам нацыянальнай даўніны, расказвае пра плямены, якія колісь насялялі наш край і ад якіх ідзе радавод беларусаў. У цэнтры ўвагі С.Асіноўскага — паганскія культы і рэлігіі, што спавядалі продкі. Не абыдзены і нацыянальныя сімвалы. Да ўсяго расказваецца пра знакамітых дзеячаў Вялікага княства Літоўскага, апавядаецца пра войны і паўстанні, што сталі вызначальнымі для лёсу беларускага народа.

"Беларусь на антычнай карце" — так назваў сваю працу С.Рассадзін. Хіба не цікава зазірнуць у Беларусь "антычную"? А зрабіць гэта і дазваляе С.Рассадзін, адштурхоўваючыся ад меркаванняў "бацькі гісторыі" Герадота, прыслухоўваючыся да голасу "бацькі геаграфіі" Страбона, не пакідаючы па-за ўвагай і іншых антычных аўтараў.

Другім, перапрацаваным і дапоўненым выданнем (першае пабачыла свет у 1989 годзе) выходзіць кніга А.Цітова "Гарадская геральдыка Беларусі". Наўрад ці ёсць яшчэ дзе магчымасць пазнаёміцца амаль з поўным зборам гербаў, якія мелі гарады і мястэчкі Беларусі. Важна, што ў гэтае выданне, у параўнанні з першым, увайшлі 59 новых гербаў паселішчаў, якія мелі права самакіравання ў XIV—XVIII стст.

Працягам добра вядомай кнігі В.Чаропкі "Імя ў летапісе" стане зборнік нарысаў, артыкулаў, эсе "Уладары Вялікага Княства", героі якога — палітычныя і вайсковыя дзеячы Міхайла Глінскі, Канстанцін Астрожскі, Мікалай Радзівіл (Руды), Леў Сапега, Ян Хадкевіч, Януш Радзівіл, Павел Сапега, Міхайла Агінскі, Аўгуст-Станіслаў Панятоўскі і іншыя.

Зазірнуць у былы Наваградскі павет запрашае В.Шаблюк. "Двор у Туганавічах" — гэта далучэнне да неўміручай творчасці Адама Міцкевіча і яго чароўнай музы Марылі Верашчакі, расказ пра ролю маёнтка ў лёсе паэта, а таксама пра далейшае жыццё гэтага ўладання, ажно да трыццатых гадоў нашага стагоддзя.

Імя К.Шышыгінай-Патоцкай добра вядома тым, хто цікавіцца мінуўшчынай Нясвіжа. Шляхам пошукаў, далейшага асэнсавання гэтай старонкі нацыянальнай гісторыі яна ідзе і ў сваёй новай кнізе "Маналогі нясвіжскіх стагоддзяў". Зноў чуцен голас саміх стагоддзяў, раскрываюцца розныя моманты з жыцця і дзейнасці дынастыі Радзівілаў. І, вядома ж, не абыдзены ўвагай К.Шышыгінай-Патоцкай тыя, хто жыў і тварыў у гэтым горадзе, уносячы свой уклад у развіццё тэатра, мастацтва, культуры...

Нарысам А.Ненадаўца "Тэадор Нарбут" папоўніцца серыя "Нашы славутыя землякі". Гаворка пра таго, хто пакінуў значны след у літаратуры, навуцы, фальклярыстыцы, археалогіі, хто напісаў дзесяцітомную "Старажытную гісторыю літоўскага народа", што мае не меншае значэнне, чым аналагічныя працы па рускай гісторыі М.Карамзіна. Але М.Карамзіна ведаюць ці не ўсе, імя ж Т.Нарбута даводзіцца па сутнасці вяртаць з небыцця.

У серыі "Помнікі беларускага дойлідства" выходзіць гісторыка-архітэктурны нарыс К.Шыдлоўскага "Архітэктурная спадчына Браслаўшчыны", а з гэтым кутком Бацькаўшчыны, як вядома, звязана дзейнасць вядомых архітэктараў А.Парака, Ю.Клоса, Л.Вітана-Дубейкаўскага.

Перавыдаецца вядомая кніга А.Клышкі "Францыск Скарына, альбо Як да нас прыйшла кніга" (адрасавана ў першую чаргу дзецям малодшага і сярэдняга школьнага ўзросту".

Пра выдатнага архітэктара, аўтара шматлікіх праектаў, рэалізаваных у забудове і манументальным мастацтве (ансамбль жылых дамоў па вуліцы Леніна ў Мінску, манумент Перамогі, помнік Я.Коласу), расказвае В.Чарнатаў ("Георгій Заборскі"). Лёс народнай артысткі СССР Г.Макаравай прасочвае А.Астапенка ("З жураўлінай чарады").

Адметны нарыс у мінуўшчыну ў кнізе А.Кіш[illegible]ва "Прадпрымальніцтва ў Беларусі".

Запланаваны і шэраг іншых выданняў, з якімі можна пазнаёміцца, зазірнуўшы ў тэматычны план "Полымя" на 1996 год.

Паэзія

Мар'ян ДУКСА

"ПАЛЮБІМ СВЕТ, ЯКІ ПЯЕ ЛЯ ВОКАН..."

●

На месцы вялікай краіны
антычныя ўсталі руіны.
Рассыпаліся цагліны
раскідзіста-мажнай даміны —
ад сонца, дажджу ці пухліны
зачахлі яны, як расліны?
Хоць новенькія панелі,
а вось безнадзейна змарнелі.
Разлезліся сцены дашчэнту —
таму што не зналі цэменту?
Таму што мінулай парою
іх склейвалі цёплай крывёю?

Ах, колькі наўкруг бедавання,
што рухнула ўсё збудаванне.
Ды сціхніце вы, небаракі,
калі не зусім вурдалакі!
А наша галоўная драма —
не друз ад дзяржаўнага храма,
а ўдушлівы пыл ад падзення,
што вочы заслаў і адзенне.
Той пыл забівае дыханне —
калі ўжо наступіць адхланне?
Галоўнае зараз — хоць трохі
прачысціць бы ветрыкам бронхі.
Адчуем і свежасць, і сілу,
як сэрца адмыем ад пылу.

●

Ніяк яна дагэтуль не астыне
і цепліцца ужо каторы год,
надзея на чужую міластыню,
якую ўсё чакае мой народ.

Так можна нораў
вырасціць жабрачы!
Занадта слабых
неаднойчы б'юць.
Таму, хто надта вохкае і плача,
бывае, нават скібкі не даюць.

Абрыдла вельмі ўласнае гавенне,
прыціснула халодная зіма?
Тады прыходзіць
добрае збавенне,
калі яго увогуле няма.

Палюбім свет, які пяе ля вокан,
і ўсе двары, што зараслі травой.
Прасноўшыся, агледземся навокал
і кветку шчасця
ў грунт пасадзім свой.

Не горш за іншых нам пасвеціць сонца.
Ён быў заўсёды жыватворны —
крах...
У рэшце рэшт успомніце японцаў,
што расцвілі
на дзікіх астравах.

СЁННЯ

Яшчэ раз
на свеце здарылася штосьці.
І вера дранцвее,
бы сцятая токам.
Паветра насычана
крыўдай і злосцю.
І кожны сябе
абвяшчае прарокам.
І крэсляцца ўсе
запаветы і межы.
Забойцы па вуліцы
ў смокінгу ходзяць.
І з крадзеных пліт
Вавілонскую вежу
індывідуальна
нячысцікі ўзводзяць.
Узвальвае доля
каменні на плечы.
Асенняя скруха
блукае па твары.
Вандруе
ў разбітых камашах галеча.
А з нораў усіх
выпаўзаюць пачвары.

ЧАЧЭНСКАЯ ЖУРБА

У матчын сон
ідуць званкі з нябыту.
Ды як дайсці да сэнсу цёмных слоў?
Ляжыць салдацік,
т о л ь к і ш т о з а б і т ы,
куслівай куляй кінуты далоў.

Адвергнуты, усімі занядбаны,
абняўшы горка
тратуар пусты,
ляжыць, крывёй сваёй апаласканы,
не заслужыўшы права на бінты.

Бягуць кудысьці воі-валанцёры,
пастрэльваючы вокам па баках.
Дымяцца едка
бронетранспарцёры,
на ўласных дагараючы кастрах.

Нявінныя жалезныя ахвяры,
якія гінуць спраўна і даўно...
Абвугленыя спяць
дамы-пачвары —
нібыта з фантастычнага кіно.

Айчынаю і ўсёй зямлёй забыты,
сярод стральбы, дыскусій і размоў
ляжыць салдацік,
т р э ц і д з е н ь з а б і т ы,
ніхто яго не едзе браць дамоў.

Спагаду злосць панішчыла дашчэнту,
панікла міласэрнасць галавой.
Б'юць у каршэнь
дваіх карэспандэнтаў
тры афіцэры ў форме палявой.

Падлічваюць наўкруг
ствалы і баксы,
і д'яблы смерці лётаюць гайнёй.
Затурканая ісціна,
як ваксай,
замазаная чыннаю хлуснёй.

Ад абурэння ўжо эфір хрыпаты,
вал спачування коціцца наўсцяж...
Спяшаюцца міністры й дэпутаты
на гойны баль або на вернісаж.

Патрачаны і з рук дзяржавы збыты,
ахвяраваны ў вечнасць назаўжды,
ляжыць салдацік,
п я т ы д з е н ь з а б і т ы,
не просячы ні харчу, ні вады.

Не чуе ён, як б'юць гарматы гулка.
Прымае пыл пакорна на шчаку.
Яму ляжаць вось так
страшэнна мулка
і спаць абрыдла на адным баку.

Ад ненасытнай кулі апалчэнцаў
хоць на пясок упаў бы ці траву...
Ах, папрасі,
Алах, сваіх чачэнцаў
што-небудзь падаслаць пад галаву.

●

Хоць і гучала песняй жаўрука,
цябе ж у гразь тапталі адмыслова.
Ты вылятала з вуснаў бедака,
о роднае, спалоханае слова.

Бо надзялялі носьбіта твайго
пагардлівай мянушкаю "колхозник",
патрохі ненавідзячы яго,
што ён звычайны невук і абознік,

вясковы недарэка ці пастух,
няўдаліца, што ад бясхлеб'я вые...
О наша слова, твой высокі дух
не адчувалі ўсе глуханямыя.

Цябе ў няволю прадалі яны,
твой звон забыўшы
й водар беларускі,
бізун чужы прыгрэўшы ля спіны
і дыялект засвоіўшы халуйскі.

Няма яшчэ канца тваёй журбе,
не дазваляе хтось узняцца вышай.
Загнаны люд цураецца цябе,
як вязня, што на волю раптам выйшаў.
Ты небам нам пасланa ў добры час
для еднасці і гонару людскога.
І хто цябе ганебна топча з нас,
той крыўдзіць вельмі і не любіць Бога.

СПРУТ

Не можа вырвацца
ў свабодны свет —
хтось непрыкметна
гасіць наш імпэт.
Яго рука
сцюдзёна-ледзяная
балюча крылы нам
перацінае.
Ні вольнасці, ні лёту,
ні адхлання —
хтось хоча нам
перахапіць дыханне.
І высмактаць
штодзённы свежы плён
жадае нехта —
прагавіты слон,
а нашу сілу
вычарпаць да донца...
Ах, мілая
дзяржава-абаронца,
уніз
прыхільна гледзячы з гары,
на нашым целе
точыш кіпцюры.
Пранікла ў долю кожную,
як спрут,
і там вядзеш свой
самачынны суд.
Каб дэман твой
над намі вечна княжыў,
скажы,
ну хто цябе ўпаўнаважыў?

●

Задзірыста глядзяць
на свет кукарды...
Вам вечна мала, ненасытна мала.
Апошнія ў нас цягнеце мільярды,
святыя абаронцы-генералы.

Не лічыце за грошы вы мільёны,
хай іншыя — не вы!
— бяруць патроху...
Зноў на памежжы польскія шпіёны?
З бярданкаю літовец напалохаў?

Зноў "ворагі" гуляюць
з намі ў жмуркі,
каб Беларусі адсячы палову?
Завод ляжачы выгледзелі туркі?
Падкрадваецца ўласавец са Львова?

Мо немец варухнуўся надта ўвішна
і з лесу ўсе лісічкі вытрасае?..
А недруг наш,
калі на тое выйшла,
зусім не з таго боку падпаўзае.

Мы край
не вельмі ўжо бензінна-хлебны,
багаты ўсё ж нукліднаю вадою...
Мы ўвогуле
каму-небудзь патрэбны
з вялікаю чарнобыльскай бядою?

●

Тры жабы скокнулі на корч
і партыю стварылі.
А потым квакалі ўсю ноч,
аб шчасці гаварылі.
Што без прымусу і маны
у светлай пазалоце
доўгачаканы рай яны
збудуюць на балоце.
Вось хлусаў бы
перамагчы —
ўсе будуць есці крабы...
А па суседстве на карчы
былі яшчэ тры жабы.
Непадалёк жа, над травой,
сядзелі, каб іх качкі,
па тры, па дзве,
і па адной
надзьмутыя спявачкі.
Цяпер з карча —
і ў гэтым соль —
не згоніш тых салістак.
І нават бусел —
іх кароль —
баіцца папулістак.
Са дня, калі пачаўся старт
пранізліва-хрыпаты,
стаіць наўкруг
суцэльны гвалт
ад ста жабіных партый.
Не хочуць лямант
прыпыніць —
адкуль крычаць ахвота?
Ніхто ж за імі не стаіць —
адно балота!

Проза

ФРЭСКІ

Яраслаў ПАРХУТА

МЕСТАЧКОВАЯ ПЛОШЧА

Усе нашы мястэчкі абліччам сваім падобныя. Асабліва іхнія плошчы, надзвычай утульныя і спрэс убрукаваныя палявым каменем. На адных камень яшчэ цэлы. На другіх — патрэскаўся ад стагоддзяў. На трэціх — злізаўся і схаваўся пад коўдрай асфальту. Але плошчы аднолькава служаць людзям.

Адзін местачковец сказаў:

— Яны і сны аднолькавыя сняць. І мову матчыну аднолькава берагуць. І жаданні народа выказваюць аднолькава. Улады мяняюцца, а патрэбы людскія застаюцца тымі ж.

...Нядаўна і мой слых на плошчы Вялікія і малыя. Свае і чужыя. І сеялі Зло, Ману і Смерць.

Першымі ачнуліся мацяркі. Падняліся ў рост, ламаючы рукі:

— Дзе ты, Апостал?

Апостал не падаваў аб сабе аніякага знака.

ХЛЕБ

І было сказана:

— Хлеб здабываць будзеш у поце твару свайго...

І чалавек здабываў. Год ад году. І дзяцей сваіх навучыў гэтаму ж. А тыя — навучылі сваіх дзяцей, тыя — сваіх.

І хлебам надзённым карміўся ўвесь свет.

Ды раптам усё перайначылася: у чалавека адабралі саху, сявеньку і жорны. Перасталі паважаць яго, а таго, падкове старой падару.

Конь-агонь зноў успомніць былую пагоню. І ад іскраў адчайных займецца паўнеба зарой.

Ну а вершнікам я прызначу адзінага сына. Хай за волю і шчасце Радзімы, як продак яго, пастаіць!

ЧАЛАВЕК І АНЁЛ

На белых крылах анёлы неслі Чалавека над зямлёй. І яму было добра. Над ім шчодра свяціла сонца, пад ім спакойна праплывалі родныя краявіды. І сэрца поўнілася дзівоснымі песнапеннямі.

— Адкуль гонар такі? — запытаўся Чалавек.

Ды раптам заўважыў: над ім гарэла чорнае сонца, пад ім цяклі атрутныя рэкі, а ў сэрцы было глуха. І Чалавек лавіў спрадвечнае:

— Хлеба, волі і лепшай долі!..

Парадокс гэта ці заканамернасць?

ДУША

Яна была ў яго спагадлівай і чулай. Як да гора чужога, так і да чужой радасці. І людзі не маглі нахваліцца:

— Светлая душа, боская!..

Дачуўся пра гэта Сатана, прыімчаў, стаў круціцца вакол, упрошваць:

— Прадай! Мне во як патрэбна душа твая! Што хочаш прасі, толькі дазволь ёй перайсці ў царства маё.

Чалавек быў натуры памяркоўнай. Паспачуваў Сатане. А душу не прадаў — за так аддаў. І тут жа зрабіўся глухім і да чужой радасці, і да чужой бяды. Жыў толькі сваім.

Людзі ўжо казалі:

— Чэрствая душа ў яго! Не мець ёй спакою ні на гэтым, ні на тым свеце...

Яно так і сталася.

Дажываў ён свой век у вялікай трывозе. А трапіў у замагільны свет — лягчэй не стала: то вазіў на сабе смалу, то кіпеў у ёй. І яшчэ нейкая страшная сіла прымушала штодзень грукаць у нізкае скляпенне замагілля і крычаць:

— Усім, хто наверсе! Даруйце і ўратуйце! Не буду болей Сатане слугаваць! Паверце!..

Але яму ўжо ніхто не верыў.

ШЧАСЛІВЫ

Як на крылах ляцеў дадому. Валошкавыя вочы гарэлі блакітам, на твары цвіла ўсмешка. Сустрэчныя таксама ўсміхаліся яму. Разумелі: на душы чалавека — вясна!

А ён раптам прызнаўся:

— Людзі! У маім сэрцы расцвіла ружа! Бачыце, як ажываюць яе пялёсткі? Чуеце непаўторнасць жыцця?

Прахожыя спыняліся, пацiскалі плячыма і ўжо не ўсміхаліся. Адзін з іх сказаў:

— Вар'ят!..

Не заўважыў каменя, кінутага ў душу. І далей не ішоў — ляцеў. Вочы гарэлі ранейшым агнём. На твары цвіла ранейшая ўсмешка.

— Вар'ят! — сказалі ўжо некалькі прахожых.

І толькі бабулька, што дагэтуль маўчала сціпла, прашаптала ўслед:

— Шчас-лі-вы!..

АПОСТАЛ

Апостал ішоў па збалелай зямлі і сеяў Дабро, Згоду і Мір. А следам беглі аблудныя і крычалі:

— Распнуць яго!

— Распнуць!

— Распнуць!..

І распнулі.

І толькі тады зразумелі, што страцілі. Па дарогах зямлі кінуліся фарысеі. хто здзекі чыніў над ім, — узносілі да нябёсаў.

І здарылася непапраўнае.

Учора на скрыжаванні гарадскіх вуліц убачыў дзядка. Ён стаяў з працягнутай рукою, і ў вачах ягоных жыла адзіная просьба:

— Падайце на кавалак хлеба!..

Яму падавалі. Тыя, хто сам рады быў чэрствай скарынцы. А тыя, у каго штодзень гнуліся сталы ад заморскай яды, праходзілі міма. Брыдзіліся нават зірнуць на яго!

...Што зрабілася з людзьмі на зямлі?!.

ПТУШКІ

На тваё плячо сеў белы голуб. Пазірае аддана ў вочы і вуркоча, вуркоча. Паведаміць штосьці важнае хоча?

На тваё плячо сеў чоран воран. Пазірае з трывогай у вочы і крумкоча, крумкоча. Паведаміць штосьці страшнае хоча?

— Голуба прывечу, ворана адпрэчу!..

Але ні той, ні другі не адкрыліся — падняліся з пляча і ў тумане згубіліся.

І тады да цябе прыляцеў мілы бусел. Стаў у небе кружыць, стаў з табою дружыць. Кружыць і клякоча, кружыць і клякоча. Чаго ж напрарочыць хоча?

— Голуба прывечу. Ворана адпрэчу. А з буслом пайду па зямлі!

ВЫШЫНЯ

Ён любіў дарогі, што вялі ўгору.

Цяжка было нагам, нялёгка было сэрцу. Але адольваў вярсту за вярстой. І ягоная душа спявала.

"Так яно і павінна быць, — радаваўся ён. — І жаваранак пяе толькі тады, як падымаецца..."

Нарэшце і яна, жаданая вяршыня. Аднак яму чамусьці думалася: "Я толькі ля падножжа яе!.." Таму прагна ўзіраўся ўдалячынь, вышукваючы новую вышыню. Знаходзіў дарогі да яе і — зноў у шлях.

Не лягчэй нагам, не лягчэй сэрцу. А ён, як і раней, адольваў вярсту за вярстою. І ягоная душа зноў спявала.

Ад песні тае карацейшай здавалася дарога, што вяла ўгору.

ПАДКОВА НА ШЧАСЦЕ

Яе знайшлі на дарозе.
І над парогам прыбілі.
На шчасце.

Толькі дзе тое шчасце? Конь у чужых табунах заблудзіўся. Каваль слынны даўно на пагосце заснуў. Смелы вершнік ад шаблі чужацкай загінуў...

Каня ў табунах Беларусі маёй адшукаю. Горан бацькавай кузні наноў распалю. Накую вухналёў. Шыпы загартую надзейна. І другое жыццё не вытрымаў:

— Вярніце мяне на зямлю! Ва ўсім, што сталася, я вінаваты!

Ён упаў на калені, стаў прасіць Усявышняга, каб зямлю пазбавіў благога.

Але Усявышні не пачуў яго.

Анёлы, пралятаючы міма, думалі:

— Чалавек не замоліць грахоў сваіх...

ДЗЕД І БАБА

Ужо каторы год кожная раніца ў іх пачынаецца аднолькава — з маўчання. Маўчаць і ўдзень, калі поркаюцца па гаспадарцы. Маўчаць і ўвечары, калі збіраюцца спаць.

І цяпер, седзячы побач, пазіраюць у акенца і маўчаць.

— А пра што гаварыць? — апраўдваецца дзед. — За жызню ўсё перагаворана, усё абгаворана. А з пустога ў парожняе пераліваць няма ніякай патрэбы.

Баба ўдакладняе:

— Цяперака толькі адно робім — жджэм, хто каго хаваць будзе...

Ці дадасі што-небудзь да сказанага?

ЛАСТАЎКА З ПЕРАБІТЫМ КРЫЛОМ

Зусім яшчэ нядаўна цешылася жыццю. На ляту лавіла дажджыны. Купалася ў сонечных промнях. Белаю грудкаю дакраналася аблокаў. А цяпер — ляжыць у траве. З перабітым крылом.

Ластаўка глядзіць, як аціхае вецер, журбоціцца сонца, плача зялёная трава, згадвае каршачка, што напаў на яе знянацку, і вялікім болем напаўняецца яе маленькае сэрца...

Ёй аніяк не падняцца. Застаецца адзінае — ляжаць. І чакаць. Канца.

Яна і ляжыць. І чакае.

А як ёй хочацца неба!

ІМЯ

Яно прыходзіць заўсёды ў бяссонне маё. І я вымаўляю адны і тыя ж словы малітвы:

— Самае светлае ў свеце, святлом дабрыні свяці! Не шкадуй цеплыні свае. Як грамнічная свечка зімою. Як сонца вясною. Ты ж з калыскі Ярылы!..

Я нясу цябе па спакутаванай зямлі, і да скону дзён не памрэш на вуснах маіх. І ўвесь час буду жадаць табе толькі светлага. У нашым вар'яцкім жыцці чорнага і так хапае!..

Прамаўляю гэту малітву і адчуваю: над бяссоннем маім прабіваецца кволенькае цяпельца святла. І сэрца не стамляецца паўтараць:

— Самае светлае ў свеце...

— Самае светлае...

— Самае...

ДАРАДЦЫ

Дзед казаў:

— Вучыся ў мураша. Глядзі, які руплівы ды старанны...

І ты вучыўся.

Бацька раіў:

— Буслінай вернасці, адданасці вучыся...

І ты вучыўся.

Маці падказвала:

— А песні? Найлепей у салоўка ім вучыцца...

І ты вучыўся.

Гады мінулі. Скроні густа прыпудрыў снег. Нялёгкіх дарог за плячыма набралася безліч... І сёння, на схіле жыццёвага дня, ты раптам адчуў, што нешта маеш і ад мураша, і ад бусла, і ад салоўкі.

І пакланіўся дарагім магілам.

ДАРОГІ

Ёсць дарогі да матчынай хаты.
Ёсць дарогі да сэрца каханай.
Ёсць дарогі да храмаў.

Дарогу да матчынай хаты заараллі плугамі. Дарогу да сэрца каханай засыпалі камянямі. Дарогі да храмаў засеялі чарнабыллем.

О, каб можна было зынічыць усё — аднавіць дарогу да матчынай хаты, сабраць камяні са сцяжыны к сэрцу каханай, а да знявечаных храмаў расцерабіць шляхі!..

Тады кожны адчуў бы наноў сэнс найдарожшага ў свеце.

КРЫНІЦА

Спрадвеку цякла за сялом і аддавала сябе ўсяму свету. Нябёсам — каб заўсёды былі блакітнымі. Жаваранку — каб ягоная песня звінела званчэй. Сонцу — каб свяціла ярка і доўга.

Аднойчы запыталіся ў крыніцы:

— А што нябёсы, жаваранак ды сонца далі табе?

У адказ пачулі:

— Сонца — сваю цеплыню. Жаваранак — сваю галасістасць. Нябёсы — блакіт свой.

Так бы кожнаму з нас!

РАЗВІТАННЕ

Усё жыццё было ў рамках, рамах і кратах. Таму рука заўсёды цягнулася да нажоўкі.

Пілаваў жалезныя прэнты і днямі, і начамі. Але не змог перапілаваць ні рамак, ні рамаў, ні кратаў. Так і сканаў, не адчуўшы ні хвілінкі волі, ні глыточка паветра свежага, ні праменьчыка сонца жывога.

Апошняй просьбай была:

— Не грайце нада мною жалобных маршаў. Не праўце доўгай імшы. І навошта развітальныя словы-прамовы? Лепш няхай чароўная скрыпка Валодзі Пузыні сыграе мне Паланез. Тады адыходзіць можна спакойна.

А праз нейкі час і вярнуцца.

...Бо з Радзімай навек не развітваюцца.

НА ТЭХНІЦЫ МІНУЛАГА

Werner Nekes

Прафесар Вернер Некес, нямецкі кінарэжысёр, педагог і кіназнаўца, у канцы верасня стаў госцем кінастудыі "Беларусьфільм". Прыбыўшы ў Мінск па запрашэнні нямецкага інстытута Гётэ, ён прадставіў праграму сваіх эксперыментальных фільмаў. Класік кінаавангарду, або, як яшчэ яго называюць, "жывая легенда "паралельнага" кіно", пазнаёміўся на нашай кінастудыі з умовамі працы сваіх нямецкіх калег, якія цяпер здымаюць у павільёнах "Беларусьфільма" кінакамедыю "Луіза". Жывую цікавасць Вернер Некес праявіў да пастаянна дзейнай на студыі выстаўкі работ мастакоў дэкарацый, касцюмаў, грыму. Паглядзеўшы работы мультстудыі і яе фільмы, спадар Некес сказаў: "Вядома, ваша апаратура — гэта тэхніка мінулага. Але дзіўна, што працуючы ўвогуле ў класічным рэпертуары, вам удаецца ствараць арыгінальныя па творчым вырашэнні фільмы. Тое ж самае можна сказаць не толькі пра аніматараў, але і пра бальшыню кінапраграм, якія мне ўдалося паглядзець у вас." Будзем спадзявацца, што сказанае прызнаным кінематаграфістам не камплімент: наведаўшы "Беларусьфільм", ён выказаў глыбокую ўдзячнасць сваім землякам з інстытута Гётэ за арганізацыю гэтай сустрэчы.

Ж.Л.

БЯРОЗАЎСКІ "ЗАРАНАК"

У гэтыя дні народны ансамбль народнай песні "Заранак" з горада Бярозы накіроўваецца ў Польшчу. Самадзейныя артысты запрошаны ў горад Плацерава, дзе адкрываецца міжнародны фестываль фальклору "Надбужанскія бяседы".

На здымку: народны ансамбль народнай песні "Заранак".

Фота Яўгена КАЗЮЛІ, БЕЛІНФАРМ

ЖЫВЕ Ў ВІЦЕБСКУ ФОТАМАСТАК

З цікавымі работамі віцебскага фотамастака Ігара Барсукова змаглі пазнаёміцца многія віцябляне на яго персанальнай выставе, якая адкрылася ў абласным навукова-метадычным цэнтры народнай творчасці.

У І.Барсукова ёсць свая любімая тэма: чалавек на Зямлі. Ёй прысвечаны ўсе яго работы.

Ігар — неаднаразовы ўдзельнік і прызёр рэспубліканскіх і міжнародных фотавыстаў.

На здымку: фотамастак Ігар Барсукоў.

Фота Аляксандра ХІТРОВА, БЕЛІНФАРМ

Музыка

"АЎТЭНТЫКА... ПЛЮС МЫ"

"Ліцвіны" — калектыў малады, але ўжо добра вядомы. Да таго ж, мае цяпер першае афіцыйнае лаўрэацкае званне. Гэтай вясной гурт стаў лаўрэатам тэлевізійнага конкурсу народнай творчасці "Залатыя ключы".

Што ж такое сённяшнія "Ліцвіны", ці мяняецца творчае аблічча ансамбля, што лічаць для сябе галоўным ягоныя ўдзельнікі? Адказы на гэтыя пытанні мы паспрабавалі знайсці разам з "Ліцвінамі" ў імправізаванай гутарцы "за кубкам гарбаты". Гаворку пачаў кіраўнік і стваральнік ансамбля Уладзімір Бярбераў.

У. Бярбераў. Добра адно, што "Ліцвіны" ёсць тое, чым былі, калі ўтвараліся. Проста неяк больш вопыту з'явілася, нешта стала атрымлівацца лягчэй. Але сутнасць тая, і гэта галоўнае. Нават калі адбываюцца такія сумныя падзеі, калі нехта сыходзіць, імідж гурта ўдаецца захаваць. Усё роўна, кожны, хто раней чуў "Ліцвіноў", пазнае іх з першых тактаў гучання і ў новым складзе.

Т. Песнякевіч. І сапраўды, так здарылася, што ў апошні час у вас з'явіліся новыя музыканты, спевакі. Але ж "ліцвінаўскі" касцяк застаўся. Вось і Наталля Захаранка спявае тут літаральна з дня ўтварэння ансамбля... Дарэчы, а вы сама — ці бачыце істотную розніцу паміж цяперашнімі "Ліцвінамі" і "Ліцвінамі" ўзору, напрыклад, 1991 года?

Н. Захаранка. Па сутнасці, я істотнай розніцы не адчуваю. Думаю, што было б вельмі дрэнна, калі б раптам надарылася адчуць гэтую вялікую розніцу, бо, як сказаў наш шаноўны кіраўнік, самае галоўнае — гэта агульны імідж "Ліцвінаў". А хто спявае, хто з'яўляецца на дадзены момант салістам, — якраз не вельмі важна. Галоўнае — тая мастацкая канцэпцыя, якой падпарадкавана наша творчая праца. Калі мы пачыналі спяваць (а мы з Аленай Шэўчык, напрыклад, вучыліся тады на філфаку БДУ), асабіста для мяне ў нейкай меры гэта было заняткам на вольны час. Ды паступова зразумела, што займацца гэтай справай непрафесійна — немагчыма. І цяпер яна, гэтая справа, —галоўная ў жыцці.

А. Шэўчык. Амаль пад кожным словам, што сказала Наталля, я магу падпісацца. Мы не здраджваем таму, што робім, з'явілася нейкае адчуванне прафесіяналізму ў лепшым сэнсе. Мы набылі прафесійныя навыкі, якія заўважаем ужо не толькі самі. Для мяне асабіста памятны такі адметны момант у гісторыі "Ліцвінаў". Калі так здарылася, што сышлі з калектыву некалькі чалавек, канечне, цяжка было, але ж у творчым жыцці гэта натуральная з'ява. А на наступны дзень мы пайшлі запісваць нашу новую касету. І вось тады, калі запісалі наша першае ўжо ў новым складзе шматгалоссе, — вось тады, шчыра кажучы, мы нават плакалі, таму што складана было гэта зрабіць, а мы зрабілі. Вось тады мы адчулі: не, мы не загінем, прыйдуць новыя людзі, і мы будзем працаваць далей. Таму цяпер, калі нешта, бывае, не ладзіцца ў жыцці ці ў творчай сферы, усё адно ведаю, што мы ўсё можам зрабіць, абы працавалі, абы стараліся, абы хацелі.

У. Бярбераў. Дадам адну такую рэч. Некалі, памятаю, я набіраў у "Ліцвіны" людзей так: я прыходзіў і чалавека запрашаў. Досыць было з ім крышачку пагутарыць, літаральна гадзінку, і мне было ясна, ці магу я гэтага чалавека запрасіць. А зараз ужо шукаць людзей значна складаней. І гэта мае натуральную прычыну. Адна справа — складаць з геаметрычных фігурак тое, што атрымаецца. А іншая справа, калі агульная форма акрэслена, некалькі фігурак выпадае і трэба ўзамен падабраць фігуркі, каб яны больш-менш падышлі. Кожны чалавек — індывідуальнасць. У яго ў манеры ёсць адрозненне, у тэмбры, у магчымасцях. Вось тут і складанасць — знайсці музыканта, які б адпавядаў таму, што ўмеў рабіць ягоны папярэднік. Між іншым, тады, у 91-ым, кожны новы поспех быў падзеяй, яркай, запамінальнай. А цяпер выступіць на нейкай імпрэзе — гэта для нас нешта такое будзённае...

Т. Песнякевіч. Але ёсць артысты, якія лічаць кожнае выступленне святам. А для вас гэта — праца звычайная, так?

Н.Захаранка. Гэта не значыць, што праца не можа быць святам.

У. Бярбераў. Праца стала святам, але і свята стала працай.

Т. Песнякевіч. Тады што ж на самай справе лічыцца святам у "Ліцвіноў"?

У. Бярбераў. Калі ў каго-небудзь дзень народзінаў... Але працягнем знаёмства з новымі творамі ў "Ліцвінах". Вось, напрыклад, раней на акардэоне ў нас іграла Марына Грыбок, цяпер іграе Юзаф...

Н. Юзаф. Я ўвогуле іграю з 87-га года, мяне ведалі ў колах адраджэння беларускасці, "талакоўцы", гурт "Дзянніца", напрыклад. Ну, а Уладзіміра Хрыставіча я ведаю даўно, і мой прыход у "Ліцвіны", можа, нават і заканамерны. Я вучыўся граць ад вясковага музыкі, потым у музычнай школе. Гэта ўсё зараз мне патрэбна для таго, каб іграць у "Ліцвінах". А ў калектыве сёння такі інструментальны склад традыцыйны, які іграе музыку, характэрную для Беларусі. Я спецыяльна не кажу, што гэта аўтэ-

ТЭНАРЫ ВЫМІРАЮЦЬ, ЯК ДЫНАЗАЎРЫ?

Уборка — справа карысная. А галоўнае — плённая. Колькі ўсяго — гатовага і ў накідах — незапатрабаванага, забытага, не даведзенага да ладу! Праз нейкі час аднойчы сказанае здаецца непатрэбным і смешным. І гэта нармальна — калі сказанае не было мастацтвам і ні на што не прэтэндавала. Іншая справа — спевы: гук даўно згас (калі гэта толькі быў гук, а не штосьці падобнае да яго), а рэха — адгалоскі, абертоны, пералівы — усё яшчэ напаўняе сабой апусцелую прастору. Музыка жыве: нават калі, здаецца, няма вушэй, што прагнуць яе пачуць. У гэтым яе сутнасць...

Толькі таму я рызыкнула выцягнуць на свет Божы дыпрагледзець шматмесячнай даўнасці нататку, прысвечаную 60-годдзю з дня нараджэння Зіновія Бабія. "Народная газета" ў асобе Алены Малочкі заказала мне яе, але чамусьці не апублікавала. Відаць, знайшліся навіны больш важныя: нехта з некім змагаўся, нехта на некага падаваў у суд, чарговая палітычная аднадзёнка патрабавала прыцягнуць усіх да адказу...

А між іншым — мо была ў тым рацыя. Я ж таксама сачыніла такую ж аднадзёнку: толькі, так бы мовіць, "пра культуру". Занадта мала я напісала пра самога спевака і занадта шмат — пра "бягучую падзею". Я маю на ўвазе арганізаваны ў нас паўафіцыйны фестываль памяці Бабія: фешэнебельны, з мяркуемым рэкламным шумам і вялікімі ганарарамі для ўдзельнікаў.

Шуму, дарэчы, не атрымалася, — што засведчыў "факт ненадрукаванасці" той маёй нататкі. Праўда, шмат народу збеглася ў оперны тэатр на "Аіду" — у гэтым спектаклі, у ролі Радамеса, некалі зіхацеў Зіновій Бабій, цяпер жа гэтую найважнейшую тэнаравую партыю выконваў 62-гадовы Уладзіслаў П'яўко. Ён у нядаўнім мінулым народны артыст СССР, а цяпер — саліст "Штаатсопера", што і паспрыяла аншлагу ў нашым тэатры. Адкуль мінскай публіцы ведаць, што ў гэтым (дарэчы, не самай першай рукі) еўрапейскім тэатры магутны і ўладарны П'яўко выконвае ролі тыпу "кушать подано" і што новы, таленавіты ды ініцыятыўны мастацкі кіраўнік берлінскай оперы — Даніэль Барэнбойм — хутчэй за ўсё расстанецца з ім ужо ў гэтым сезоне?

Ведаць, канечне, няма адкуль. І публіка прыйшла палюбавацца на былога народнага артыста і яго маладую жонку Людмілу Магамедаву. Магамедава — таксама салістка берлінскай "Штаатсоперы" — вельмі нядрэнна выконвала ў той вечар партыю Аіды... Хоць абаіх гастралёраў, у сукупнасці й паасобку, ці не начыста перайграла наша Наталля Руднева (Амнерыс). "Брава, Наталі!" — з французскім акцэнтам крычала галёрка; "Наталі" — гэта каб ніхто не пераблытаў і не прыняў на свой адрас. Прыемна...

І разам з тым сумна. Таму што ёсць у нас у тэатры Амнерыс, ёсць Аіда (і нават, як ні дзіўна, не адна), але няма Радамеса. Я маю на ўвазе — сапраўднага Радамеса, такога, якім быў Бабій, з асаблівым, "радамесаўскім" голасам: цёмным, цёплым, яркім, звонкім, "з металам", з пяшчотай, лірычным і драматычным — усё адначасова; іначай нічога не атрымаецца. І ўсе вартасці Аіды і Амнерыс, уся раскоша музыкі, уся прыгажосць старамодна-рэалістычных, прыгожых дэкарацый, — усё будзе нікому не патрэбным і пойдзе прахам.

Тэнар — гэта, магчыма, самая цудоўная, самая нешараговая з'ява свету оперы; гэта ўвасабленне юнацкай мужнасці і ўладарнай высакароднасці прынцаў. Гэта сам дух оперы. Дык дзе ж вы, спадкаемцы З. Бабія? Няўжо не нараджае вас наша зямля? Альбо няма для вас дастойных настаўнікаў?

Нам скажуць: "Адкуль жа ёй радзіць, калі ваша зямля бедная на вакальныя таленты, жабрацкая і няплённая ў мастацтве спеваў? Забэйда-Суміцкіна эміграцыі. Быў вось Зіновій Бабій, ды й той нарадзіўся і вывучыўся на Украіне; а Беларусь ён ашчаслівіў проста так, паводле выпадковага збегу абставін".

І часткова ў гэтым ёсць рацыя — у тым, што тычыцца "выпадку" Бабія. Напэўна, дзевятнаццацігадовы хлапчук, які першы раз у жыцці развітваўся з родным прыкарпацкім сялом Підсадкі, і не ўяўляў, што яго чакае такі лёс. Яго, як і іншых хлапчукоў з сяла, забіралі ў армію: хто мог уявіць, што ў яго знойдуць голас і вызначаць салістам ансамбля Прыкарпацкай ваеннай акругі?

Дэмабілізаваўшыся ў 1957 годзе, ён ужо цвёрда ведаў сваю дарогу і паступіў у Кіеўскую кансерваторыю, якую скончыў у рэкордна кароткі тэрмін — за 2 гады. З першага ж курса яго запрасілі ў якасці саліста ў Кіеўскі тэатр оперы і балета, але пасля заканчэння чамусьці там не пакінулі. Магчыма, прычына была самай банальнай: праліска. Але, здаецца, яна хавалася глыбей: у тагачасным недаверы да "западынцаў", асабліва да тых, хто (хоць бы дзіцем) заставаўся на акупаванай тэрыторыі. Невыпадкова ж да канца сваіх дзён Бабій так і "не спадобіўся" членства ў КПСС...

Што ж, значыць — Львоў... Малады спявак быў, відаць, рэдкім падарункам для тамтэйшай оперы. На працягу трох гадоў яму даручаліся як мінімум чатыры вядучыя партыі, і якія! Рудольф, Каварадосі, Хазэ, Радамес; партый, пра якія ён у Маскве або ў Кіеве марыў бы яшчэ гадоў 10. Прынамсі, у Маскве ён пабываў — на гастролях з родным калектывам.

Гастрольны вецер занёс яго і ў Мінск. 2 мая 1962 года, яшчэ будучы салістам Львоўскага тэатра, Зіновій Бабій з вялікім поспехам дэбютаваў на беларускай опернай сцэне ў партыі Хазэ; яго партнёркай у партыі Кармэн была Лідзія Галушкіна. Праз тыдзень, 10 мая 1962 года, ён бліснуў у "Аідзе": у спектаклі ўдзельнічалі Нінэль Ткачэнка (у той час — таксама салістка Львоўскага тэатра), Лідзія Галушкіна, Ігар Сарокін.

Яшчэ амаль сезон малады спявак прабыў у Львове. Але ў Мінску дырыжор Іосіф Абраміс і рэжысёр Дзмітрый Смоліч ужо рыхтавалі спектакль "Атэла" — спецыяльна на Бабія. Гэта была першая яго работа ў нашым тэатры — і сапраўдны трыумф, які зрабіў яго бясспрэчным лідэрам. Прэм'ера "Атэла" (у якой таксама ўдзельнічалі Тамара Шымко і Анатоль Генералаў) была адной з яркіх падзей у гісторыі беларускага ДАВТа. Новай "зоркі" на той момант ледзь споўнілася 28 гадоў...

Выступаюць "Ліцвіны". *Фота У. Панады*

нтыка. Бо многае адбываецца не толькі ў прасторы, але і ў часе. Вось, скажам, гадкоў праз 70 падыдуць да нашых Наталлі і Алены студэнткі: "Ой, спадарыня Наталля, Алена, а можа, праспяваеце такую песню?" і скажуць: "Во, вось гэта — аўтэнтыка, а мы так не можам". Калі сёння бабулькі спяваюць, дык мы кажам: вось гэта аўтэнтыка! То мы ж і самі ў свой час апынёмся ў той самай аўтэнтыцы.

У. Бярбераў. Стыль "Ліцвіноў" можна характарызаваць як рэтрастыль. Як у архітэктуры, заўважце, у канцы 19 стагоддзя былі распаўсюджаны розныя стылі "пад старажытнасць" — пад барока будавалі, пад готыку. Можна сказаць, што ў музыцы стыль "Ліцвіноў" — гэта як бы "пад аўтэнтыку". Гэта не аўтэнтыка, бо хочам мы ці не, гэта аўтэнтыка плюс мы. Але давайце далей знаёміцца з новымі ўдзельнікамі нашага ансамбля. Вось Ігар Пятроў.

І. Пятроў. Што тычыцца асабіста майго ўдзелу ў гурце, скажу так: "Ліцвіны" ўзнялі маё майстэрства, няхай не вельмі вялікае, ігры на кларнеце (я скончыў музычную школу па класе кларнета). Думаю, я — натура творчая, бо мне цяжка жыць без спеваў ды без ігры на кларнеце. Вось Уладзімір Хрыставіч і на дудзе мяне вучыць іграць.

У. Бярбераў. Ігар такі чалавек, які, здаецца, зайграе на ўсім, што ні дай у рукі. Вось раптам сталася б так, што мы пабагацелі, дык я зрабіў бы вельмі проста: на халеру Ігару дзесьці працаваць, я купіў бы яму шэраг музычных інструментаў, ведаючы, што праз годзік Ігар зайграе на кожным з іх. Разумееце, гэта чалавек такі: перад ім пакладзіце інструмент — то не супакоіцца, пакуль не навучыцца на ім іграць! Ну, і яшчэ адзін новы ўдзельнік, хаця і даўні наш знаёмы, — Павел Захаранка.

П. Захаранка. Як я прыйшоў у "Ліцвіны"? Гэта быў, скажу так, працэс не балючы, але працяглы. Наталля Захаранка — мая родная сястра. І вось быў час — гады са два, — калі я прыехаў з вёскі, паступіў у педінстытут і вельмі часта прыходзіў з сястрой на рэпетыцыі, на канцэрты "Ліцвіноў". Заўсёды ў першым радзе сядзеў і з вялікай цікавасцю назіраў, што там адбываецца. Але сам асабліва не спяшаўся далучыцца. І толькі праз пэўны час неяк адважыўся і паспрабаваў зайграць на сваім першым інструменце ў "Ліцвінах". Але як чалавек з "вялікімі прэтэнзіямі", я адразу ўзяўся за самы вялікі інструмент — гэта бубен. І цяпер я іграю на бубне, а хобі — спяваю, стараюся спяваць. Але ж ведаеце, чалавек — такая істота: калі за нешта возьмецца, у яго апетыт адразу развіваецца. Паспрабаваўшы іграць на бубне і потым паспяваўшы, ухапіўся за прапанову Уладзіміра Хрыставіча пайграць на жалейцы. Узяўся цяпер за жалейку.

Т. Песнякевіч. Адкуль жа, цікава, "прыходзяць" у "Ліцвіны" самі песні і найгрышы, якія ўрэшце атрымліваюць адметную інтэрпрэтацыю ў гурце?

У. Бярбераў. Як і раней, з усіх крыніц. Кожны можа прапанаваць у гурце нейкі нумар, песню, музыку, якую знойдзе ці ведае ад сваіх продкаў. Не грэбуем нічым, што ўзята са зборнікаў. Бывае, што слухаем фальклорныя запісы, нешта спадабаецца— і бяром у рэпертуар. Матэрыялу, дзякуй Богу, хапае. Шкада толькі, што не можам гэтак шмат рэпеціраваць, каб мець надзею за сваё жыццё хоць дзесятую частку гэтага ўсяго выканаць.

Т. Песнякевіч. Але ж я ведаю, што "Ліцвіны" працуюць мэтанакіравана і натхнёна. Дзве касеты сваіх запісаў у ансамбля ўжо ёсць, рыхтуецца трэцяя. Згадзіцеся, гэта ўжо шмат для фальклорнага калектыву, які ўтварыўся гады чатыры таму. Няхай поспех спадарожнічае "Ліцвінам" у іх высакароднай справе, якая гаворыць — гучыць, спявае! — сама за сябе.

Таццяна ПЕСНЯКЕВІЧ

І зноў трыумф — праз год, у спектаклі "Арэстэя", пастаўленым Таццянай Каламійцавай і Дзмітрыем Смолічам (Электра — Тамара Шымко).

Абодва тыя спектаклі былі з вялікім поспехам паказаны на гастролях у Маскве. Рэцэнзуючы "Арэстэю" ("Правда", 7.02.64г.), Л. Грошава пісала: "Асобна хочацца сказаць пра выканаўцу цэнтральнай партыі Арэста — З. Бабія. Ён валодае сапраўдным драматычным тэнарам, вельмі прыгожым і моцным, і мог бы заняць асаблівае месца на нашым вакальным "небасхіле".

На другі сезон работы ў Мінску малады артыст атрымаў першае і апошняе ганаровае званне: народны артыст БССР. Між іншым, гэты тытул успрымаўся толькі слабым ценем яго празмернай папулярнасці. Яму было наканавана зіхацець на беларускай сцэне яшчэ 13 гадоў... Па сутнасці, ён не зрабіў той кар'еры, якой быў варты, ён не ўзняўся вышэй па лесвіцы поспеху, якая часта несправядліва расстаўляе спевакоў па ранжырах: бліжэй да падножка — Бабій, вышэй — Лемешаў, на самым версе — у свабоднай групіроўцы — Каруза, Джыллі і Марыя дэль Монака. Адзначым між іншым, што на сімвалічнай "лесвіцы славы" Казлоўскі стаяў куды вышэй за Лемешава, хоць для кожнага, хто мае вушы, відавочна, што справе гэта адпавядала з адваротнай дакладнасцю.

А што ж Бабій?

Вядома ж, яго рады былі бачыць і ў Маскве, і ў Ленінградзе. Бо паводле прынятай у нас наменклатуры галасоў ён быў драматычны тэнар: "дэфіцытная" вакальная спецыяльнасць, голас, прыдатны для Радамеса, для Атэла, для Германа... Спяваў ён лірычныя партыі: Рудольфа, Герцага, Фаўста... А на самай справе — усе тэнаравыя партыі хадавога рэпертуару, акрамя Ленскага. Мяркуючы па захаваных запісах, вакал ягоны быў поўны моцы і бляску і разам з тым цудоўна пластычны ў кантылене. У Бабія быў звышмагутны голас з найбагатай тэмбральнай палітрай, велізарны драматычны тэмперамент і адметная сцэнічная знешнасць.

Аднак афіцыйна Маскву ён не пакарыў. Не было яму дарогі і за мяжу, да сусветнай свядомасці. Здараліся, праўда, гастрольныя паездкі ў тагачаснае "бліжняе замежжа": у Балгарыю, Венгрыю, ГДР, Польшчу... У той час гэта было далей і складаней, чым цяпер — у Злучаныя Штаты або ў Аўстралію. Удалося яму пабываць і ў Францыі, і ў Канадзе — у гасцях колішніх суайчыннікаў...

Але ўсё гэта былі канцэрты. Як оперны артыст Бабій выступаў за мяжой — наколькі мне вядома — толькі адзін раз. Гэта была бліскучая "Тоска" 4 ліпеня 1972 г. у Вроцлаве, пра якую дагэтуль успамінаюць мае польскія сябры...

А між тым, Зіновій Бабій меў усе дадзеныя для таго, каб ярка паказаць сябе на міжнародным оперным небасхіле. У адрозненне ад многіх іншых, ён яшчэ тры дзесяцігоддзі таму пераадолеў вядомыя недахопы расійскай школы спеваў (пра якія гавораць сёння ўсё часцей і часцей): шырокую і грубую вібрацыю, нягнуткасць фразы, эмацыянальны "перахлёст"... Але самае галоўнае — ён быў сапраўдны універсал: спяваў усё, не баяўся ні лірычных, ні драматычных партый. Гэта быў адзін з самых рэдкіх выпадкаў для тагачаснай савецкай вакальнай школы. У выніку — у класічным італьянскім рэпертуары Бабій пачуваўся "як дома". Невыпадкова, калі ён прыехаў на стажыроўку ў Мілан, вучыць яго там адмовіліся: ён усё ўмеў і проста купаўся ў атмасферы вялікай опернай культуры, рыхтаваў новыя партыі...

Многае так і не збылося. Ці не таму — раптоўна прачнулася патрэба ў алкаголі, журбота, хваробы, што наваліліся на яго ў самым росквіце жыцця?..

У 1977 годзе, пасля перанесенай ім вельмі цяжкай аперацыі (замена сардэчнага клапана), Бабій вымушаны быў пакінуць оперную сцэну і цалкам аддацца канцэртнай дзейнасці. Цяжкі пералом у лёсе быў змякчаны той акалічнасцю, што ён і раней шмат выступаў на самых розных пляцоўках. На працягу сваёй не вельмі доўгай кар'еры ён падрыхтаваў 40 канцэртных праграм, пастаянна запісваў пласцінкі, якія і захавалі для нас непаўторны голас.

Апошнія 7 гадоў свайго жыцця ён "меў пасаду" саліста Беларускай дзяржаўнай філармоніі. Да канца дзён захаваў па-юнацку палкую любоў да мастацтва, страсную захопленасць сваёй працай, памкненні і надзею... Ён паўгода не дажыў да свайго 50-годдзя...

З тых часоў былі ў нашым тэатры і іншыя тэнары. Вячаслаў Полазаў, напрыклад, які гадоў 12 назад, выправіўшыся на міжнародны конкурс у Японію, не вярнуўся і атабарыўся ў Злучаных Штатах. Нейкі час спяваў вядучыя партыі ў "Метраполітэн-опера" — пакуль не пасварыўся з тамтэйшым "царом і богам", дырыжорам Джэймсам Лівайнам, — а цяпер устанавіў сваю штаб-кватэру, здаецца, у Чыкага. Зрэшты, ці не ўсё роўна? Яму ж даводзіцца спяваць па ўсім свеце...

Быў Іван Шупеніч — першы з тэнараў беларускай школы, які дамогся поспехаў на вялікіх міжнародных конкурсах. Ён цяпер спявае ў Брно, а дадому прыязджае на канікулы. Часам — бо афіцыйна застаецца салістам роднага ДАВТа — выступае ў мінскіх спектаклях; мінулым летам удзельнічаў у пастаноўцы "Рыгалета" і нават з'ездзіў з тэатрам на гастролі. Ды вось усё неяк перамянілася. Сёлета ў чэрвені Шупеніч прыязджаў пабачыць блізкіх, але месца ў афішы для яго так і не знайшлося. Свае "каронныя" спектаклі — "Яўген Анегін", "Травіята", "Чыо-Чыо-сан", — спявак глядзеў разам з намі — з залы... Магчыма, таму, што мы такія багатыя і тэнараў няма куды падзець?

Ёсць, праўда, яркія асобы. Напрыклад, Марат Грыгорчык. На мой погляд, ён зможа дасягнуць усяго — калі толькі адолее пакутлівы для яго духоўны крызіс. Я сказала б — крызіс веры, які абцяжарвае спяванне як свабоднае волевыяўленне духу, што пазбаўляе яго цёплай энергіі і пераможнай сілы. Бяруся меркаваць, Марат цяпер на правільным шляху да пераадолення; але якіх яшчэ душэўных выдаткаў гэта будзе яму каштаваць?

Альбо, напрыклад, Сяргей Франкоўскі. Голас у яго надзвычай прыгожы; але яму навязана старамодная, абясцэненая школа і адпаведная манера спеваў, ад якой яму пакуль не ўдаецца пазбавіцца. Ёсць пяцікурснік Аляксандр Жукаў, якому ў гэтым сэнсе яшчэ цяжэй.

Ды не гэта галоўнае. Так, тэнары вымяраюць, як дынозаўры, — але ж яны і адраджаюцца, як феніксы. Згінуўшы ад нязграбнага дотыку, яны ўваскрэснуць, як толькі людзі зноў захочуць ім пакланяцца. Тэнар можа быць ці кумірам, ці "казлятонам" — трэцяга не дадзена. Але ён не можа быць кумірам, пакуль мы, уздыхаючы, пераконваем сябе і іншых, што залатая эпоха тэнараў незваротна мінула! У гэтым няпраўда, бо немаведама колькі стагоддзяў запар гаворыцца, што ўсё мінула! Але нічога не мінае, лесвіца з дня ў дзень мкне ў неба. Да дасканаласці. Да зорак.

Праўда ж у тым, што да дасканаласці вельмі цяжка дабрацца.

P.S. Калі я рыхтавала гэты матэрыял, за сцяной пачула цудоўны голас. Спяваў Зіновій Бабій. Тэхнічны прагрэс зрабіў галасы несмяротнымі; паміраюць толькі людзі.

Юлія АНДРЭЕВА

СТАН, ПРАБЛЕМЫ, ПОШУКІ... ВОЛЬНАГА ЧАСУ

Міністэрства культуры і друку Рэспублікі Беларусь сумесна з Беларускім інстытутам праблем культуры і іншымі зацікаўленымі арганізацыямі і ведамствамі 20-21 снежня 1995 года праводзяць навукова-практычную канферэнцыю "Культурная сфера вольнага часу: стан, праблемы, пошукі".

Да ўдзелу ў канферэнцыі запрашаюцца культуролагі, сацыёлагі, псіхолагі, педагогі, эканамісты, кіраўнікі дзяржаўных і іншых арганізацый і ўстаноў культуры.

У праграме канферэнцыі прадугледжваецца абмеркаванне наступных асноўных тэм:

Гістарычна-сацыялагічныя аспекты станаўлення і развіцця культурнай сферы вольнага часу на Беларусі;

Навукова-тэарэтычныя падыходы да вывучэння сацыяльна-культурнай дзейнасці ва ўмовах вольнага часу;

Роля ўстаноў культуры ў задавальненні інтарэсаў і запатрабаванняў насельніцтва ў сучасных умовах;

Удасканальванне фінансава-эканамічных механізмаў рэгулявання дзейнасці ўстаноў культуры;

Рэгіянальная культурная палітыка, фарміраванне рэгіянальных сацыяльна-культурных праграм;

Сацыяльна-псіхалагічныя і педагагічныя асновы арганізацыі вольнага часу розных груп насельніцтва;

Інфармацыйна-метадычнае ўзаемадзеянне ўстаноў і арганізацый сацыяльна-культурнай сферы і інш.

Па адназначных накірунках плануецца пленарнае пасяджэнне, работа секцый, творчых лабараторый з удзелам навукоўцаў і практыкаў Беларусі, Расіі, Украіны, Літвы і Польшчы.

Заяўкі на ўдзел у канферэнцыі і тэзісы дакладаў і выступленняў (аб'ём 4-5 старонак машынапіснага тэксту, надрукаванага праз 1,5 інтэрвалы, у двух экземплярах) просім дасылаць да 30 кастрычніка 1995 года. На асобным лісце неабходна пазначыць прозвішча, ініцыялы, пасаду, навуковую ступень і званне, месца працы і тэлефон.

Мяркуецца выданне тэзісаў і зборніка матэрыялаў канферэнцыі ў поўным аб'ёме.

Тэлефоны для даведак: 63-05-38 Крыловіч Марыя Андрэеўна; 65-43-50 Макарава Алена Аляксандраўна.

Адрас: 220086, Мінск, Калінoўскага 12, Беларускі інстытут праблем культуры

ВАНДРОЎКА Ў ЗЛАТУ ПРАГУ

Ажыццявілі яе днямі сябры клуба "Беларуская хатка" ў Мінску. Яшчэ згладзіліся ўражанні ад жнівеньскай сустрэчы пад дахам дома Максіма Багдановіча, на якой прэзентацыю сваёй новай кнігі "Крыло анёла" ладзіў гасцінны гаспадар музея паэт Эдуард Акулін, як ужо адбылася і чарговая — верасневая: "Беларусы ў Празе". Францішак Скарына, Тамаш Зан, Міхась Забэйда-Суміцкі, Пётра Крачэўскі, Ларыса Геніюш, Сокалаў-Воюш і Данчык — вось далёка няпоўны спіс слынных сыноў і дачок крывіцкай зямлі, для якіх Прага ў розныя часы стала або выспай збавення ад палітычных рэпрэсій, або ціхай жыццёвай гаванню на доўгія гады.

А дапамог здзейсніць падарожжа студэнт Акадэміі музыкі Аляксей Фралоў — цікавай і змястоўнай лекцыяй і маляўнічым слайд-фільмам аб Залатой Празе.

Н. КАРНЕЕНКА

ПАД АДНОЙ ВОКЛАДКАЙ

ПОЛЬСКІЯ ВЕРШЫ ЯНКІ КУПАЛЫ

Польскамоўныя вершы Янкі Купалы. Яны былі перадрукаваныя на машынцы і сабраныя паэтам у адзін сшытак. Пасля там-сям з'явіліся аўтарскія праўкі і запіс: "Пісаў у 1906 г. І. Луцэвіч". Ці намераваўся паэт выдаць іх асобна, адгадаць цяжка. Ва ўсякім разе, пад аднымі вокладкамі былі аб'яднаны не ўсе вершы, напісаныя Купалам па-польску. У сшытак не трапілі творы, якія, паводле агульнай згадкі паэта, публікаваліся як быццам у часопісе "Ziarno" ("Зерне"), а таксама прысвячэнне сястры Леакадзіі і жартоўны верш "Кабеце", датаваны 14 ліпеня 1904 года і запісаны Купалам на той старонцы, на адвароце якой маецца бадай ці не першы яго твор на беларускай мове — "Мая доля", пазначаны датаю 15 ліпеня 1904 года, і вершаваная страфа, блізкая паводле зместу да "Мае долі". Відочна, Купала кіраваўся мастацкім прынцыпам выбару, калі, складаючы машынапісны сшытак вершаў, палічыў патрэбным не ўключаць у яго іншыя свае польскамоўныя творы. Прысвячэнне сястры паэта згубілася ў завірусе дзён, змест лірычнага жарціка "Кабеце" працяглы час не быў даступны, бо старонка з яго тэкстам была заклеена, а вершы, змешчаныя ў польскім друку, з-за няпэўных звестак наўрад ці будуць калі атрыбутаваны. Адзін з іх — "Малітва". Вершы "Кабеце" і "Малітва", з якімі беларускі чытач пакуль не меў нагоды пазнаёміцца, будуць абавязковыя ў Поўным зборы твораў Беларускага Песняра.

Польскамоўная паэзія Янкі Купалы — пэўная даніна білінгвальным традыцыям беларускага літаратурнага жыцця ў мінулым стагоддзі. Шлях ад іх засваення да іх пераадолення ён прайшоў надзвычай хутка. І гэта быў подзвіг яго чалавечага духу, подзвіг, які не мог не здзейсніцца, бо ў ім ужо магутна і таленавіта пачынала біцца сэрца прарока, чаканага выпрабавальнай гісторыяй беларускага адраджэння. Стыхія роднай беларускай мовы вывела паэта на бязмежныя прасторы адкрыцця новых мастацкіх магчымасцяў, вызначыла нацыянальнае сцвярджэнне яго паэтычнага генія.

Уладзімір МАРХЕЛЬ

ЯНКА КУПАЛА

КАБЕЦЕ

Малады, вучоных працаў
Я чытаў калісьці многа:
Скуль было кабеце ўзяцца —
Не зайшоў аб тым нічога.

Што яна — найбольш цікава.
Ці яна дабро святое?..
Ці для шчасця, для забавы?..
Ці яна праклянце злое?..

Так напэўна б я ў бязгрэшны
І ў няведанні застаўся,
Каб, раз Янкеля сустрэўшы,
Пра ўсё чыста не дазнаўся.

Янкель слыў практычнай славай,
Як жыд кожны замыслёны,
І таму з кабечай справай
Знаўся лепей за вучоных.

І кабет ужо нямала
Ім за жыцце памяняна.
Любасць дорачы ім стала,
Ён уведаў іх заганы.

Быў ён жыд — з тае нагоды
Верыць можна без пагрозы,
Бо прыемна нейк заўсёды
Слухаць нам жыдоўскі розум.

Вось тады што Янкель гэты,
Распавёў мне пра кабету:

Што загадкай ёсць жанчына,
Што разумная надзвычай,
Што, ўявіце, быць павінна
Гэта кепска ўсё зазвычай.

І хто толькі парываўся
Распазнаць яе, даследваць,
Той не раз пераканаўся,
Што яе не ў стане зведаць.

Ды загадка ў тым спазнанні,
Да якога прагнем рвацца
Мы ажно і пры скананні,
Часта страшнай можа здацца.

Вам кажу: калі ахвота
(Так далей мне Янкель баяў),
Жыць на свеце без турботы,
Каб ад злога Бог вас збавіў,

То не рвіцеся ніколі
Спазнаваць загадку гэту,
Бо памылак ёсць даволі:
Не раскрыць ніяк сакрэту.

І калі ў сіло ўпадзеце,
Што пастаўлена кабетай,
То напэўна прападзеце,
Нібы ў згубнай апраметнай.

МАЛІТВА

Мой дух дарма крывёй сцякае
І мысль дарма ў пакуце скача
Пад роспач несціхана.

Жальба не выбавіць зямная
І не ўратуе скарга з плачам —
Мне толькі ў Твой бок пазіраці,
Прачыстая Хрыстова Маці!
Панна!..

Хвала Табе, Святая Пані!
Плывуць маёй пакуты гукі
Да ног Тваіх у гімне!

О, не пакінь у вышнім ззянні!
Бо голас мой нязбытай мукі,
Нібыта ліст, віхурай гнаны,
А сэрца, бы з суцэльнай раны,
Гіне!

Уявы, мроі, сноў снаванне —
Усё сплыло ў жыццёвай хвалі,
Хвастаў лёс у аблудзе!

Я цацкай быў яго гуляння,
І хоць цярпенні спавівалі,
Заўсёды з гордай быў душою,
Пагардай не плаціў сваёю
Людзям!

З польскай пераклаў
Уладзімір МАРХЕЛЬ

МІХАСЮ НЯХАЮ — 60

Крытык і літаратуразнавец Міхась Няхай — родам з вёскі Галоўныя Ляды Бярэзінскага раёна. У 1954 годзе скончыў Багушэўскую сярэднюю школу, служыў у арміі, працаваў на розных прадпрыемствах, у рэдакцыі тагачаснай Камарынскай раённай газеты. У 1964 годзе завочна закончыў факультэт журналістыкі Беларускага дзяржаўнага універсітэта, у 1968, таксама завочна, аспірантуру Мінскага педагагічнага інстытута.

З 1968 па 1970 год М.Няхай — рэдактар, загадчык рэдакцыі ў выдавецтве Беларускага дзяржаўнага універсітэта, з 1970 па 1972 — загадваў праблемнай навукова-даследчай лабараторыяй Беларускага інстытута народнай гаспадаркі. З 1973 года працаваў ў Магілёўскім дзяржаўным педагагічным інстытуце — выкладаў беларускую літаратуру, загадваў кафедрай беларускай літаратуры, з'яўляўся дэканам філалагічнага факультэта. З 1978 года — дацэнт кафедры беларускай літаратуры Мінскага інстытута культуры, навуковы кансультант міжкафедральнай навукова-даследчай лабараторыі студэнтаў па літаратурным краязнаўстве.

Літаратурную працу М.Няхай пачаў у 1962 годзе, выступаючы з артыкуламі па праблемах развіцця літаратуры, з рэцэнзіямі на кнігі, з краязнаўчымі нарысамі. Выдаў манаграфію "Рускі дэмакратычны нарыс 60-х гадоў XIX стагоддзя" (1969). Аўтар кнігі гумарыстычных апавяданняў "Грыцюкоў характар" (1986), даследчыцкай працы "Сустрэчы з Прыдняпроўем. Янка Купала і Якуб Колас на Магілёўшчыне" (1992).

Віншуем Міхася Васільевіча з 60-годдзем! Зычым яму здароўя, поспехаў у жыцці і творчасці!

ТРЭЦІ НУМАР

"Беларускага гістарычнага сшытка" з часу яго выхаду і першы за сёлетні год выйшаў у Беластоку. Адкрываецца ён артыкулам А.Шаланды "Да пытання аб паходжанні герба Хадкевічаў...". "Сітуацыя беларускага насельніцтва ў Польшчы ў 1945-1956 гадах" — тэма выступлення Я.Мірановіча. Абодва гэтыя матэрыялы змешчаны па-беларуску.

Не менш цікавыя і польскамоўныя публікацыі, што ахопліваюць розныя аспекты мінуўшчыны, у тым ліку і той, што тычыцца польска-беларускіх стасункаў. А.Мірановіч знаёміць з малавядомай геральдычнай распрацоўкай, аўтар якой М.Шанціла выкарыстаў хронікі, архівы і летапісы літоўскіх князёў да 1650 года. Рукапіс гэтай унікальнай працы захоўваецца ў архіве Пецярбургскага аддзела Інстытута гісторыі Акадэміі навук Расіі. С.Александровіч, расказваючы аб стане беларускай гістарыяграфіі да 1918 года, прыходзіць да высновы, што наспела патрэба новага фундаментальнага гістарычнага сінтэзу. Пра тое, як дзейнічала беларуская самаабарона на Беласточчыне ў 1945—1947 гадах, можна даведацца з матэрыялу С.Іванюка.

Нямала ў нумары і іншых матэрыялаў.

ДА ЮБІЛЕЮ МАТЭМАТЫКА

На будынку Гомельскага навукова-даследчага інстытута механікі металапалімерных сістэм, дзе размешчаны і філіял Інстытута матэматыкі Акадэміі навук РБ, адкрыта мемарыяльная дошка ў гонар акадэміка, матэматыка Сяргея Антонавіча Чуніхіна, які больш за 30 гадоў адпрацаваў у Гомелі.

На адкрыцці мемарыяльнай дошкі прысутнічалі ўдзельнікі навуковай матэматычнай канферэнцыі з Украіны, Расіі, Беларусі, якая і была прымеркавана да юбілею вядомага матэматыка.

Фота Сяргея ХАЛАДЗІЛІНА, БЕЛІНФАРМ

Пошта

УЧОРА... І СЁННЯ

Так балюча за родную, блізкую, гаротную мову! Прыходзіцца чуць у яе адрас, а, значыць, і ў мой, столькі пагарды, грэблівасці, скептычнай іроніі, што — цяжка, немагчыма жыць. Я — чалавек эмоцый, і мне не заўсёды ўдаецца стрымліваць сябе. Нават не дапамагае славуты Дэйл Карнегі, які пераконвае, што стрыманасцю і паблажлівасцю можна дасягнуць у жыцці вышынь, раўнавагі і спакою.

Скажыце, як можна быць спакойным, калі цябе за ўсё жыццё спрабавалі зразумець (ці толькі прыкідваліся) толькі нядаўніх пяць гадоў. Хто шчыра, а хто следуючы модзе пачалі вывучаць продкамі перададзеную нам мову. Мяне гэта радавала.

Ды не паспелі аб'явіць вынікі рэферэндуму, як свет вывернуўся шыварат-навыварат. Я многіх проста не пазнаю. Не хапае вачэй, розуму ці мудрасці, каб пазнаць ці зразумець. Я доўга сябе лічыла нядрэнным псіхолагам. Аказваецца, памылялася.

Мяне мала хто падтрымлівае ў дачыненні да мовы. Некаторыя, мусіць, нядрэнна засвоіўшы ўрокі Дэйла Карнегі, абыходзяць моўнае пытанне. Яны жывуць прынцыпамі: усё роўна, на якой мове размаўляць. Ім адно не ўсё роўна — чым набіць свой страўнік, хату і дачу.

І як тут не будзеш узрушаны, калі паўтараецца нядаўняя гісторыя, якая здарылася са мной на Лепельшчыне.

Памятаю, як падалі свой смелы голас нефармалы ў абарону і адраджэнне мовы, культуры, герба і сцяга Беларусі. Мяне не трэба было пераконваць (як беларусазнаўцу) у вывучэнні роднай мовы, я шчыра радавалася пачатаму руху, была ад усведамлення неўміручасці нашай нацыі на сёмым небе. З сябрамі па газеце і радыё пазнаёміліся з праграмай адраджэння беларусаў. Памятаю, крыху спрачаліся па асобных пытаннях, але ўсё ж пагадзіліся, што над дакументам працавалі сур'ёзныя людзі, адукаваныя і апантаныя ў сваёй справядлівай і пачэснай для люду беларускага і краю роднага справе. Менавіта тады мы і пазнаёміліся з сям'ёй Вінцука Вячоркі, пабылі ў іх у гасцях. Мяне ўразіла ў іх доме, што ўсе — ад дзетак 2—5 гадоў да сяброў Вячорак, якія таксама сабраліся тым днём, — размаўлялі, прытым лёгка, нязмушана, на нашай роднай мове. Было радасна і прыемна на душы і на сэрцы.

Але ўсё тое было хутка азмрочана тым, што нас... пачалі праследаваць, высочваць, учыняць допыты, прыпісваючы нам фантастычна-неверагодныя ўчынкі. Мяне асабіста здымалі з урокаў, пакідаючы вучняў адных у класе, каб учыніць доўгі допыт, які вёўся сакратаром райкама партыі ў прысутнасці дырэктара школы (урокі якога таксама зрываліся) і сакратара партарганізацыі мясцовай гаспадаркі. Яны ўтрох, то лагодна, то пераходзячы на крык, спрабавалі выцягнуць з мяне адказы, у якіх "падвальных" памяшканнях мы збіраемся, дзе, у колькі і ў якія дні, чаму мы выбралі беларускую мову (самае галоўнае пытанне часу!), чаму мы хочам аддзяліць Беларусь ад Савецкага Саюза і выгнаць усіх рускіх з рэспублікі. Калі я паказала свой пашпарт з запісам маскоўскага нараджэння і што я па нацыянальнасці — руская, то і на гэты довад яны прыводзілі шмат неверагодных домыслаў...

Амаль паўгода я вымушана была даводзіць, што я не слон, не вярблюд і... не бык, што мову рускую, матчыну, паважаю на ўзроўні з беларускай, бацькавай, але калі я жыву ў Беларусі, дык буду гаварыць на роднай мове майго народа.

Маім расчараванням і бедам, здавалася, не будзе канца. Неўзабаве, праз нейкі час, усё тое мне зноў нагадалі — тады, калі мая асоба падлягала ў школе і раёне атэстацыі і калі я падала заяву аб уступленні ў рады камуністычнай партыі.

Напярэдадні мне напісалі проста ідэальную характарыстыку. І раптам... характарыстыку рашылі перагледзець і перапісаць, зрабілі яе да смешнага супярэчнай і з вывадам: у сваіх поглядах і перакананнях я няўстойлівая, са мною неабходна праводзіць адпаведную выхаваўчую работу...

Памятаю спецыяльнае пасяджэнне ў раёне. Я адчувала на сабе спапяляючыя погляды прысутных і несхаваную нянавісць толькі за тое, што я абрала сваёй мэтай у жыцці прапаганду роднай мовы...

Гэта было нядаўна. Нешта падобнае паўтараецца і сёння.

У аддзеле народнай адукацыі афармляю адзін з дакументаў. Пішу на беларускай мове. Запоўніўшы канцылярскі бланк, аддаю яго супрацоўніцы. Спатыкнуўшыся на слове "жнівень", жанчына раптоўна ўскідвае на мяне вочы.

— Что это?

— Жнівень. Месяц такі, — адказваю.

— А какой это месяц по-русски?

— Август.

— Больше по-белорусски у нас не пишите.

— Гэта чаму ж?

— У нас документы оформляются только на русском языке...

Дай, Божа, мне цярпення!

Вера БУЛАНДА

в. Навасёлкі, Барысаўскі раён

пшаніцы, у адным Антон убачыў тоненькую ружаватую іголачку з малюсенькай, ледзь прыкметнай расінкай на кончыку. То быў праростак зярняці.

— Узыходзяць! Узыходзяць! — радасна паўтараў ён сам сабе.

Другое гняздзечка было пустое. Але была надзея, што ўзыдзе і тое зерне, раз узышло гэта. Жэбрак па-ранейшаму штораніцы бегаў на дзялянку. Цяпер яго цікавіла, ці ўзыдзе другое зерне. Не менш, чым прафесар Жэбрак, хвалявалася і Зоя Дзмітрыеўна. Але праходзіў тыдзень, другі, трэці, месяц — так другое зерне і не ўзышло...

Страта была вялікая і балючым шкадаванне. Але суцяшала тое зерне, якое ўзышло і пакуль расло нармальна. Зрабілі аналіз лісцікаў. Выявілася, што ў клетках гэтай пшаніцы ўтрымліваецца па 42 храмасомы. Дослед удаўся. Але была толькі адна такая расліна... Гэта трывожыла Жэбрака, хоць ён і суцяшаў Зою Дзмітрыеўну, што і з аднаго зерня можна з часам вырасціць столькі насення, што хопіць, каб засеяць сотні, тысячы гектараў. Адно, каб усё далей ішло добра.

— Зоя Дзмітрыеўна, пакідаю гэту расліну цалкам на вашу апеку. Упэўнены ў паспяховым завяршэнні нашага доследу. А я бяруся за новыя.

Ішоў час, мінуў май, настаў чэрвень, пачыналі выплываць каласы ў пшаніцы на калгасных палях, а тая адзіная расліна на доследнай градцы не давала сцябла. Доўгія вузенькія лісцікі яе слаліся па зямлі, жоўклі і высыхалі. Вырасталі новыя лісцікі, зноў слаліся па зямлі, а сцябліна не ўздымалася. Пачаліся розныя здагадкі. Ці не хварэе расліна на якую хваробу? Ці не точыць яе карэньчыкі чарвяк або лічынка якога жука? Зоя Дзмітрыеўна праз моцную лупу пільна агледзела ўсе лісцікі, але нічога не знайшла, расліна была непашкоджаная.

Антон Раманавіч прыйшоў да беспамылковага вызначэння прычыны застою ў росце і развіцці адзінай расліны — мутантны гібрыд пшаніцы быў апладнёны пылком азімай пшаніцы. Каб азімая пшаніца пайшла ў рост і дала каласы, трэба каб яна прайшла стадыю халоднай тэмпературы. Таму і сеюць азімыя ўвосень, каб яны ўзімку прайшлі халодную стадыю развіцця. На гэтай прыроднай аснове Лысенка і стварыў тэорыю стадыйнага развіцця раслін. Адзінае тое зерне з доследу Жэбрака мела ўласцівасці азімага, а высеялі яго вясной. Стадыю холаду яно не прайшло, таму не магло даць сцябла і коласа.

Вырашана было пакінуць расліну на зіму.

З боязі страціць расліну Зоя Дзмітрыеўна, без ведама Антона Раманавіча, перанесла яе ў лабараторыю, дзе тая не магла прайсці стадыю холаду і наступным летам... загінула. Перанос расліны ў лабараторыю быў памылкай. Каб яна засталася на зіму на доследнай дзялянцы, то ў наступнае лета дала б ураджай.

Антон Раманавіч і Зоя Дзмітрыеўна сумна і моўчкі стаялі ля градкі з засохлай раслінай... Дослед не ўдаўся...

— Што будзем рабіць далей? — спытала яна свайго прафесара, адчуваючы віну за правал доследу.

— Што будзем рабіць? Мой настаўнік, амерыканскі прафесар Морган, у такіх выпадках раіў: "Калі вам адразу не ўдалося, рабіце, рабіце, рабіце зноў!" — нагадаў ён вядомае ўжо Пранішнікавай амерыканскае правіла.

Пранішнікава сумна ўсміхнулася.

— Сізіфава праца, Зоя Дзмітрыеўна. Але паспрабуем паспаборнічаць і з Сізіфам. Упэўнены, што нам удасца вынікі нашых доследаў узняць на вяршыню навукі і замацаваць іх там, — сказаў Антон Раманавіч.

Ён супакоіў Зою Дзмітрыеўну тым, што першы дослед не быў поўным правалам. У ім была атрымана расліна пшаніцы з 42 храмасомамі шляхам штучнай мутацыі, выкліканай апрацоўкай насення калхіцынам, і атрыманы мутантны гібрыд-паліплоід, гэта значыць, з падвоенай колькасцю храмасом у клетках. Галоўнае ў доследзе ўдалося, а да канца яго не давялі з прычыны памылкі. Застаецца адно — паўтарыць дослед.

Неяк пры сустрэчы з Вавілавым Мікалай Іванавіч спытаў у Жэбрака, як ідуць доследы са штучнай мутацыяй. Антон Раманавіч расказаў усё як ёсць.

— Антон Раманавіч, віншую з подзвігам! — узнёсла прамовіў Вавілаў, трасучы Жэбрака за абедзве рукі. — "Правал" вашага доследу вывеў вас у лік першых генетыкаў свету, якія выклікалі штучную мутацыю і атрымалі мутантныя гібрыды.

Вавілаў даў высокую разгорнутую ацэнку "няўдалага" доследу Жэбрака. Па-першае, гэты дослед, як і доследы яшчэ двух-трох эксперыментатараў у паліплаідыі ў свеце, далоўніў тэорыю Дарвіна аб паходжанні відаў. Апроч натуральнага адбору, новыя віды ў прыродзе з'яўляюцца яшчэ і шляхам мутацыі. Па-другое, абвергнута тэорыя аўтагенезу — нібы змены спадчыннасці арганізмаў адбываюцца пад уплывам толькі ўнутраных, нематэрыяльных фактараў. Дослед Жэбрака, як і іншых пачынальнікаў, даказвае, што змены спадчыннасці арганізмаў, іх эвалюцыі адбываюцца пад уздзеяннем знешняга прыроднага асяроддзя. Па-трэцяе, дослед Жэбрака раскрыў прыродны метад стварэння новых відаў раслін.

— Чакаю новых подзвігаў! — паўтарыў сваё звычайнае пажаданне Вавілаў, развітваючыся з Антонам Раманавічам.

У наступным доследзе Жэбраку сапраўды ўдалося атрымаць паліплаіднае насенне пшаніцы з 42 храмасомамі ў клетках. Такая пшаніца, з 42 храмасомамі, існавала і да эксперыментаў Антона Раманавіча і мела шырокае распаўсюджанне ў пасевах многіх краін. Толькі невядома было, як, адкуль яна з'явілася. Яна была знойдзена ў прыродзе, але знайсці яе продкаў вучоным не ўдавалася, хоць і вяліся шырокія пошукі іх. Выказваліся розныя здагадкі, але высветліць яе паходжанне вучоныя не змаглі.

Доследы Жэбрака даказалі, што 42-храмасомная пшаніца з'явілася ў выніку стыхійнай мутацыі і скрыжавання ў прыродзе 28 і 14-храмасомных пшаніц. Яму ўдалося штучна стварыць тое, што магла рабіць толькі сама прырода. Разам з тым удалося даказаць, што чалавек можа, шляхам мутацыі і селекцыі, стварыць новыя віды раслін. Важна было і тое, што метады Жэбрака не ставілі чалавека над прыродай, не былі агрэсіўнымі супраць прыроды, а былі экалагічна чыстымі, дзейнічалі паводле яе законаў.

У далейшых доследах Антон Раманавіч ставіў задачу атрымаць пшаніцы з яшчэ большым лікам храмасом. І ў тых доследах былі ўдачы і няўдачы. Так, у адным з доследаў было апрацавана калхіцынам 385 зярнят — 305 аднаго віду гібрыдаў і 80 другога. З пасеяных 385 зярнят узышло толькі пяць: чатыры расліны першага віду і адна расліна другога віду пшаніц. З 305 зярнят узышло адно... Ад першага апылення гэтых пяці гібрыдных раслін пшаніцы не завязалася ні аднаго зерня. Паўторнае апыленне дало 14 зярнят. У 27 разоў менш, чым сеялі...

Высокая бясплоднасць, кволасць зярнят, дрэнная ўсходжасць былі ўласцівы першаму пакаленню паліплаідных гібрыдаў. Другога ахапіла б расчараванне, у адчаі махнуў бы рукой на такія доследы, але ў Жэбрака быў настойлівы характар. Да тога ж ён помніў дэвіз Моргана: калі табе не ўдалося адразу — не апускай рук. Антон Раманавіч не адкінуў доследы, а ўзяўся за ўсебаковы, глыбокі аналіз вынікаў даследавання і ўмоў яго правядзення. Ён заўважыў, што часцей за ўсё не ўзыходзіла, гінула насенне, апрацаванае высокай канцэнтрацыяй калхіцыну. Ён прымяніў двайную апрацоўку насення слабым растворам калхіцыну. Беднаватыя былі і глебы, асабліва на мікраэлементы. Дабавіў угнаення пад доследныя культуры. У выніку эфектыўнасць доследаў павялічылася.

Каб пераадолець бясплоднасць паліплаідных гібрыдаў, Жэбрак скарыстаў селекцыю і скрыжаванне паліплаідаў з геаграфічна аддаленымі відамі і сартамі пшаніцы. Ён скарыстаў пшаніцы, сабраныя акадэмікам Вавілавым на Блізкім Усходзе. Такім метадам яму ўдалося дабіцца высокай ураджайнасці паліплаідных гібрыдаў. Ён вывеў новы від пшаніцы з 56 храмасомамі і назваў яе "Пшаніца савецкая ўсходняя Жэбрака". Такога віду пшаніцы, з такой колькасцю храмасом у клетках, прырода раней не ведала. Яе стварыў чалавек, карыстаючыся законамі прыроды. Чалавек пайшоў далей за прыроду ў стварэнні новых форм раслінных арганізмаў.

У 1941 годзе акадэмік Жэбрак меў ужо 32 віды амфідыплаідных (з храмасомамі двух відаў) пшаніц. Паралельна з пшаніцамі Антон Раманавіч распачаў доследы з грэчкай і просам.

Доследы Антона Раманавіча Жэбрака спрыялі развіццю класічнай генетыкі. І сам аўтар гэтых доследаў стаў больш актыўным у барацьбе з Лысенкам, Прэзентам і іхнімі паплечнікамі.

Абрадавала і ўзмацніла актыўнасць класічных генетыкаў выбранне заснавальніка храмасомнай тэорыі спадчыннасці арганізмаў, амерыканскага прафесара Томаса Ханта Моргана ганаровым акадэмікам Акадэміі навук Савецкага Саюза.

Узмацнялася, пашыралася і абвастралася крытыка Лысенкам, Прэзентам і іхнімі паплечнікамі "фармальнай" генетыкі, як яны называлі класічную генетыку. Сутычкі адбываліся на розных нарадах, навуковых канферэнцыях, розных сходах, але яны былі спантанныя, ад выпадку да выпадку. Па ходзе гэтых спрэчак відаць было, што і лысенкаўцы, і класічныя генетыкі рыхтуюцца да рашучага бою.

СПАДКАЕМЦЫ

Так ужо сталася, што сёлетні год аказаўся юбілейным не толькі для Яніса Райніса, але і для яго спадкаемцаў, яго сучаснікаў, якія сустракаліся з паэтам, кантактавалі, мелі творчыя стасункі. Перадусім, гэта Сяргей Пятровіч Сахараў (29.09.1880, Полацк — 22.04.1954, Рыга), беларускі фалькларыст, этнограф, педагог. З 1921 па 1922 гады ён узначальваў Беларускі аддзел пры Міністэрстве асветы Латвіі, а потым Дзвінскую беларускую дзяржаўную гімназію. Я ўжо друкаваў у "ЛіМе" (у нумары ад 6.IX.1985 г.) дакументы перапіскі С.Сахарава і Я.Райніса. Але ў маім архіве засталося некалькі рукапісных старонак Сяргея Пятровіча, якія перадала калісьці мне дачка Сахарава — Ірына Сяргееўна. Нататкі маюць загаловак: "Светлой памяти латышского народного поэта Яна Райниса-Плекшана (мои воспоминания о встречах с ним в 1921-1929 гг.)". Прапаную невялікі ўрывак з тых пажоўклых старонак, нагадаючы, што таму, хто пісаў іх, сёння спаўняецца 115 гадоў з дня нараджэння.

"Паводле канстытуцыйнага звычаю, які існаваў у Латвійскай рэспубліцы з часу яе заснавання (1918 г.), кожная нацыянальная меншасць павінна мець сваіх законным чынам выбраных дэпутатаў у Латвійскім сейме. Беларусы з выпадку сваёй слабай арганізаванасці такога дэпутата-абаронцы не мелі, які мог бы ўзняць у сейме пытанне аб культурнай аўтаноміі для беларусаў.

Дзе выйсце?

І вось пагляды беларускай інтэлігенцыі скіраваліся на папулярную фігуру латышскага паэта Я.Райніса, дэпутата Латвійскага сейма па сацыял-дэмакратычным спіску. Я.Райніс адыграў такую вялізную ролю ў гісторыі латвійскіх беларусаў, што лічу неабходным хоць крыху затрымацца на гэтым моманце.

Сам Райніс нарадзіўся і вырас сярод беларускага насельніцтва — у Ілукстанскім павеце (...) І вось калі з'явілася ў ліпені месяцы 1921 г. беларуская дэлегацыя перад паэтам Райнісам, то ён сустрэў яе асабліва ветла і ласкава. Прыгадваю лагодную ўсмешку Райніса, яго светлы пагляд і яго характэрнае паторгванне плячамі.

З вялікай увагай Райніс выслухаў просьбу беларускай дэлегацыі. У гутарцы ён выказаў свае пачуцці сімпатыі да шматпакутнага беларускага народа і адразу ж выявіў сваю поўную згоду ўзяць на сябе ролю абаронцы культурных інтарэсаў як у сейме, так і ва ўрадавых установах.

Акрыленая і ўзнадзеяная словамі Райніса, беларуская інтэлігенцыя дружна прынялася за работу. Культурна-асветная справа сярод латвійскіх беларусаў развівалася і мацнела. Пад духоўным кіраўніцтвам Я.Райніса адбывалася ўзаемадзеянне і сяброўскае супрацоўніцтва між латышскай і беларускай культурамі. Вось чаму светлая памяць аб народным латышскім паэце ніколі не знікне з сэрцаў беларусаў і будзе жыць вечна!

Сяргей САХАРАЎ".

Сёлета споўнілася б па 90 гадоў паэту Пятру Сакалу (Масальскаму) і мастаку Міхасю Калініну. Пятро Аляксандравіч нарадзіўся 1 ліпеня 1905 года ў мястэчку Пасінь Люцынскага павета Віцебскай губерні (цяпер — в.Пасіене Лудзэнскага раёна ў Латвіі). Пасля сканчэння Люцынскай беларускай гімназіі вучыўся на Беларускіх настаўніцкіх курсах у Даўгаўпілсе. Некаторы час працаваў настаўнікам-практыкантам у Дзвінскай беларускай дзяржаўнай гімназіі. Пятро Сакол — аўтар зборніка "На світанні". Ён першы перакладчык твораў Райніса і першы перакладчык дайнаў.

У пісьме Я.Райнісу ад 29 ліпеня 1926 г. К.Езавітаў пісаў: "Я ўмольна прашу Вас перамовіцца з універсітэцкім начальствам, каб яно прапусціла хоць некалькі нашых юнакоў ва універсітэт. Двое юнакоў, вельмі таленавітых, хочуць паступіць у Акадэмію мастацтваў. І пра іх мая просьба. Пасадзейнічайце іх прыёму".

Тымі юнакамі, аб якіх паклапаціўся Я.Райніс, былі Пятро Мірановіч і Міхась Калінін. Шкада, што з-за нястачы Міхаіл Сямёнавіч правучыўся ў Акадэміі толькі два гады. Але тое, што ён пакінуў пасля сябе (памёр 14 лютага 1975 г.), заслугоўвае нашае пашаны. Работы М.Калініна захоўваюцца ў Мінску ў Скарынаўскім цэнтры. Дзякуючы яго дачцэ Святлане Міхайлаўне на выстаўцы "Яніс Райніс і Беларусь" вы зможаце ўбачыць асобныя працы гэтага таленавітага самародка з беларуска-латгальскага памежжа, земляка Я. Райніса.

Сяргей ПАНІЗНІК

ПАМЯЦІ СЯСТРЫ ЯКУБА КОЛАСА

Змарнела, абламалася апошняя галіна густога Міхалавага дрэва — не стала Марыі Міхайлаўны Бруй, апошняй, трынаццатай, з дзяцей Міхала і Ганны Міцкевічаў.

Жыла, векавала яна ў слыннай Мікалаеўшчыне. Прыязна і пачціва ставіліся да яе суседзі дый усе вяскоўцы. Прыязджалі на радзіму песняра людзі. Знаёміліся з тутэйшымі мясцінамі, з матэрыяламі філіяла музея. Некаторыя, больш цікаўныя, завітвалі і да Марыі Міхайлаўны. І яна, узрушаная гэткай павагай, ахвотна аддавалася ўспамінам. Прыгадвала даўно мінулыя гады, найперш жыццё-быццё сям'і Міцкевічаў. Успамінала, як з маці ездзіла да Кастуся ў турму...

Ніколі не забывалася ёй першая сустрэча Коласа з Купалам. Гэта яна, дванаццацігадовая Маня, бегала з хутара Смольня ў Мікалаеўшчыну клікаць Кастуся. Маці не ведала, як лепей дагадзіць шаноўнаму госцю, якую пасцель паслаць хлопацам на вышках. Ды бянтэжнасць гаспадыні зняў сам Купала:

— Нічога, Каласок пад галаву — пераспім. Людзі мы прывычныя...

Рухавасць думкі, гарэзлівасць былі ўласцівыя сястры народнага паэта. Свой расказ яна нязменна перасыпала дасціпнымі жартамі. Часам для паўнаты гаворкі і песню завядзе. Найчасцей — беларускую народную... Не абыходзілася, зразумела, і без дэкламацыі братавых вершаў. Іх на паліцах памяці Марыі Міхайлаўны захоўвалася багата. Выдатна чытала самадзейная артыстка Купалу, Крылова, Пушкіна...

Здзівіла калісьці паэтава сястра сваёй

фенаменальнай памяццю С. Александровіча, А. Лойку і Ю. Пшыркова падчас запісу яе ўспамінаў пра Якуба Коласа. Сваё захапленне расказчыцай даследчыкі выказвалі ў друку.

...Марыя Міхайлаўна Бруй пражыла доўгі век — праз два месяцы ёй было б 95. І ўсё ж для блізкіх людзей смерць Коласавай сястры — страта.

Пухам Вам, Марыя Міхайлаўна, мікалаеўская зямля!

Іван КУРБЕКА

Супрацоўнікі Літаратурнага музея Якуба Коласа смуткуюць з прычыны смерці сястры народнага песняра — Марыі Міхайлаўны Бруй і выказваюць спачуванне родным нябожчыцы.

"РОДАМ З... ЗЯМЛІ КРЫВІЧОЎ"

СЯРГЕЙ КАНЁНКАЎ І БЕЛАРУСЬ

З маленства, з даўняга знаёмства з рэпрадукцыямі твораў Сяргея Цімафеевіча Канёнкава знаходжуся ў некаторым палоне мастацкай стыхіі гэтага выдатнага скульптара.

Што яднае яго з Беларуссю?.. Ці толькі нараджэнне на бліжняй Смаленшчыне, іначай кажучы — на тэрыторыі, лічы што, этнічнай Беларусі?.. Не толькі.

У вучылішчы жывапісу, скульптуры і архітэктуры С.Канёнкаў паступіў у 1892 годзе. А ў гэты ж час (з 1889 па 1897 год) там вучыўся і В.Бялыніцкі-Бяруля. Безумоўна, яны не маглі не быць знаёмымі. Сурыкаў, Рэпін, Левітан — вось імёны, аднолькава судакранальныя і з Канёнкавым, і з Бялыніцкім-Бірулём, нашым славутым земляком.

Ужо пражыўшы ў мастацтве нямала гадоў, адмераўшы амерыканскую частку свайго лёсу, сталага веку чалавекам Канёнкаў любіў падарожнічаць. І як вынік — напісаў выдатны нарыс "Падарожжы па краіне (Пісьмы з дарогі)". Цытую па кнізе Сяргея Цімафеевіча "Зямля і людзі": "...Хто як яго называў, гэты дзень. Хто — "Святам лета, хто — Сёмухай. Але па ўсіх вёсках смаленскіх і беларускіх (мы за адзін дзень пракаціліся ад Смаленска да Гомеля), не дамаўляючыся, звінелі гармонікі, калі ў сціплых, небагатых на выгляд хатах танцаваў народ. На Смаленшчыне — кадрылі, на Беларусі — лявоніху". І далей: "У... беларускай вёсцы пашчасціла нам убачыць, як танцуюць усе — ад малога да старога. Пяці-шасцігадовыя дзеткі раз-пораз зыркалі на старэйшых і пакуль яшчэ няўклюдна паўтаралі за імі элементы шматфігурнага народнага танца. І старыя танцавалі — падкрэслена грацыёзна, асцярожна.

Ізноў такі каштоўны вопыт, што прафесіяналу толькі чэрпаць і чэрпаць нястомна. Шматфігурная кампазіцыя ў жывапісе ці скульптуры масавая сцэна на тэатры — вось дзе першапачаткова разварочваюцца, тут да іх і прыглядацца трэба!"

Яшчэ адзін беларускі штрых у творчай і жыццёвай біяграфіі С.Канёнкава — праца над партрэтам нашага суродзіча біёлага Васіля Купрэвіча. Вось апісанне гэтай работы, выкананай у 1967 годзе (Сяргею Цімафеевічу было тады ўжо 93 гады!): "Скульптар увёў у кампазіцыю партрэта выказванні Купрэвіча пра праблему старэння чалавечага арганізма і тайну жыцця і смерці.., выразаўшы іх у дрэве і своеасабліва абраміўшы імі выяву вучонага". Два варыянты партрэта Купрэвіча — гіпсавы і з дрэва — знаходзяцца ў Смаленскім музеі мастацтваў імя С.Ц.Канёнкава.

Але чаму менавіта Купрэвіч як асоба захапіў Канёнкава? Што каларытнага ў вачах, у твары нашага суродзіча? Адказ — у навуковай біяграфіі Васіля Феафілавіча Купрэвіча. Энцыклапедыі даволі суха тлумачаць яе. Большай часткаю перадаюць спіс пасад, займаемых вучоным у розны час. Сярод іншых — і пасада прэзідэнта Акадэміі навук Беларусі (на працягу 17 гадоў! да самай смерці). Быў Купрэвіч і дырэктарам Батанічнага інстытута АН СССР. Што ж да навуковых абсягаў, то энцыклапедыя так гаворыць пра гэта: "Аўтар прац па фізіялогіі хворай расліны, сістэматыцы грыбоў, глебавай энзімалогіі. Выявіў пазаклетачнае выдзяленне ферментаў у аблігатных паразітаў і прапанаваў гіпотэзу аб прагрэсіўным скарачэнні і спецыялізацыі ферментнага апарата паразітных грыбоў у працэсе іх эвалюцыі. Упершыню даказаў, што расліны могуць засвойваць для фотасінтэзу вуглекіслату, якая трапляе ў каранёвую сістэму з вадою з глебы. Адкрыў пазаклетачныя ферменты, якія выдзяляюцца кончыкамі каранёў вышэйшых раслін, і гэтым даказаў магчымасць гетэратрофнага жыўлення вышэйшых раслін у прыродных умовах. Абгрунтаваў магчымасць выкарыстаць актыўнасць глебавых ферментаў як паказчык біялагічнай актыўнасці глебы". І гэта сталася першаштуршком для Канёнкава? Канешне ж, не. Першаштуршок высвятляецца з успамінаў сына скульптара Кірылы Сяргеевіча. Вось што ён піша: "Бацька вельмі цікавіўся ўсім, што датычыцца пытанняў прадаўжэння жыцця, выпадкамі доўгажыхарства. Я падбіраў яму розныя матэрыялы з гэтай вобласці. Аднойчы я прынёс яму артыкул пра акадэміка В.Ф.Купрэвіча, надрукаваны ў часопісе "Техника — молодежи". Гэты выдатны вучоны думае гэтаксама, як і бацька: закона смерці ў прыродзе не існуе. Чалавек падобны рацэ. Гэтак жа, як вада ў рацэ мяняецца, а рака застаецца, так і клетачкі чалавечага арганізма адмираюць і адраджаюцца зноўку, не змяняючы арганізма ў цэлым. Смерць — гэта ненармальнасць, хвароба, з якой можна і неабходна змагацца. Калі яна з'яўляецца вынікам змянення ў генах, трэба выпраўляць гены. Трэба працаваць над гэтай праблемай, і плён будзе дасягнуты".

Бацька і сын Канёнкавы чыталі літаральна ўсё, што можна было адшукаць пра Купрэвіча, нават праглядалі некаторыя з яго прац.

Сяргей Цімафеевіч стараўся ўявіць сабе Купрэвіча і зрабіў партрэт гэтага вучонага, імя каторага (Канёнкаў не памяваўся ў гэтым) павінна заняць дастойнае, ганаровае месца сярод самых першых вучоных чалавецтва хаця б ужо за такія вось словы: "Няма аб'ектыўнага закона прыроды, каторы б сцвярджаў: так, жывы арганізм павінен паміраць. І ніколі не будзе адкрыты гэты закон, яго няма ў прыродзе".

Так у гісторыі мастацтва паядналіся два лёсы, два тытаны чалавечай дзейнасці.

Беларусь і Канёнкаў... Усе нітачкі-повязі вядомага скульптара з нашай старонкай яшчэ не адкрыты. Наперадзе — удумлівы пошук, высвятленне многіх і многіх акалічнасцяў. Відаць, і лісты Канёнкава ішлі на Беларусь. Жыў жа Сяргей Цімафеевіч дзейсна, энергічна. А ў Брэсце, пачынаючы з 1966 года, рэктарам інжынерна-будаўнічага інстытута працаваў адзін з руплівейшых даследчыкаў творчасці Канёнкава — Ігар Дзмітрыевіч Белагорцаў. Таксама смалянін, зямляк скульптара.

І напрыканцы давайце зазірнём у першую манаграфію пра Канёнкава (Пецярбург, "Светозар", 1920) Сяргея Глаголя: "Канёнкаў родам з старадаўняй зямлі крывічоў, дзе здаўна "грязи смоленские невылазные и леса брянские дремучие", дзе жывуць "лесовики, спокойно сосредоточенные люди, точно знающие какую-то тайну"... Пра нашу ж, крывіцкую, старонку!

Алесь КАРЛЮКЕВІЧ

"ЦУДАМ АЦАЛЕЎ ТЭАТР..."

Чым далей ад нас падзеі Вялікай Айчыннай вайны, тым больш каштоўным робіцца кожны дакумент, кожнае сведчанне пра тыя трагічныя дні. Сярод асабістых матэрыялаў вядомага беларускага пісьменніка і тэатразнаўцы Яўгена Рамановіча, якія захоўваюцца ў Беларускім дзяржаўным архіве-музеі літаратуры і мастацтва, ёсць адзін, які кранае сваім драматызмам, апальвае гарачым подыхам вайны. Гэта ліст яго жонкі, Зінаіды Крачко, — першая вестачка, дасланая Першаму Беларускаму дзяржаўнаму тэатру ў Сібір з вызваленага ад немцаў Мінска.

Зінаіда Мацвееўна доўгі час працавала ў БДТ-1 сакратаром-справаводам, добрасумленна адносілася да сваёй працы і шчыра любіла тэатр, адчувала сябе часцінкай гэтага калектыву, які стаў для яе родным і неабходным. Пачуццё было ўзаемным. Акцёры і тэхнічны персанал вельмі паважалі сваю "Зіначку" за далікатнасць, добразычлівасць, інтэлігентнасць, душэўную стойкасць і разважлівасць. "Вы ўмацоўваеце сабой веру ў існаванне сумленных, высакародных, прыгожых людзей. Вас любіць увесь калектыў — і гэта павінна саграваць Вас у жыцці. Гэта не кожнаму дадзена", — пісала ёй у адказ актрыса Вольга Галіна-Александроўская.

Шчаслівае мірнае жыццё было знішчана чорным чэрвеньскім ранкам 1941 года. Вайна разлучыла сем'і, разбурыла чалавечыя лёсы. Яўген Рамановіч, які працаваў загадчыкам літаратурнай часткі БДТ-1, апынуўся з тэатрам у эвакуацыі ў Сібіры, а жонка з сынамі і яго хворай маці засталася ў акупіраваным немцамі Мінску. Ліст Зінаіды Крачко, напісаны пасля вызвалення Мінска, размінуўся з адрасатам, але дайшоў да нашых дзён, як горкі напамін пра жахі вайны, невыносныя выпрабаванні і трываласць чалавечага духу ў самых драматычных абставінах жыцця.

Ліст друкуецца ў перакладзе на беларускую мову з невялікімі скарачэннямі (ф. 243, воп. 1, с. 309, л. 1-3).

г. Мінск, 21.07.1944

Дарагія таварышы, усе, усе, усе!

Як прыемна гучыць гэта слова "таварыш", ад якога мы ўжо адвыклі за 3 гады. Столькі ёсць слоў, столькі чаго расказаць, а з чаго пачаць, не ведаю. Перажыта так шмат, уся душа перагарэла, нерваў ужо няма. Усе мы бачылі сваімі вачамі і павешаных, і няшчасных галодных палонных, якія пілі ваду з вулічных луж і з-за шалупіння гнілой бульбы ледзь горла не перагрызалі адно аднаму, знішчэнне яўрэяў, калі кроў лілася па вуліцах, і масавыя забойствы палонных, калі забітымі ў патыліцу была ўсеяна ўся Савецкая ад выстаўкі да Таварнай, і спальванне ў хатах людзей, якія падазраваліся ў сувязі з партызанамі, і, нарэшце, з самага пачатку вайны і аж да сённяшняга дня — бамбёжкі. Можаце ўявіць сабе гэтыя абставіны, калі кожны дзень чакаеш налёту спачатку савецкіх, а потым нямецкіх самалётаў, на ноч забіраешся ў яму, а на досвітку ўваходзіш у хату. Усе нервовыя, дзеці таксама.

Як мы чакалі гэтага дня, як мы марылі пра той шчаслівы дзень, калі мы зможам, нарэшце, вольна ўздыхнуць, адчуць сябе па-сапраўднаму людзьмі. Гэты дзівосны дзень настаў, мы яго перажылі, яго не забудзеш ніколі. Асабліва востра яго адчувалі ўсе тыя, хто так цярпліва і так горача чакаў, таму што апошнія дні ўцёкаў немцаў суправаджаліся ўсімі жахамі — выбухамі, пажарамі. Мінск спалены на тры чвэрці, проста жахліва становіцца, калі праходзіш праз увесь горад, — толькі і засталіся драўляныя хацінкі па ўскраінах і дзе-нідзе сярод іх каменныя дамы. Праўда, нейкім цудам ацалеў наш тэатр, дом ЦК (новы), палова Дома Чырвонай Арміі з тэатрам, Дом урада і яшчэ сёе-тое. Але вораг па-драпежніцку знішчае і тое, што засталося, не лічачыся зусім з насельніцтвам. Мы жывём так: раніцою кіпіць работа, а ўвечары развітваемся ўсе, таму што не спадзяёмся сустрэцца заўтра. Было ўжо два такія страшэнныя налёты, асабліва апошні, учарашні. Відавочна, што ўвесь раён ад Заходняга да Бетоннага моста, найбольш ацалелы — знесены, спалены дашчэнту. У мяне такі настрой, што наўрад, калі будуць яшчэ такія налёты, мы з Вамі сустрэнемся. Якое гэта было вялікае гора, няшчасце, што мне не ўдалося з сям'ёй выехаць у чэрвені 1941 г. Пакінуць дзяцей я не магла і не мела права. Пісаць пра гэтыя пакуты доўга, калі будзем жывыя і сустрэнемся — раскажу. Давялося мне пазнаёміцца і з камерай СД. Але ўсё гэта ўжо ў мінулым. І так нясцерпна хочацца, каб бацька ўбачыў дзяцей, якіх з такімі цяжкасцямі захавала жывымі і здаровымі, а пасля гэтага ўсё ж такі хочацца жыць, бачыць дзяцей ужо дарослымі, бачыць вынікі сваёй працы. Як часта і цёпла я ўспамінала ўвесь тэатр, якія Вы ўсе цудоўныя акцёры. Калі я, прыйшоўшы на працу ў тэатр, разбірала фотаархіў, моцна знішчаны, але ўсё ж такі, у асноўным, ацалелы, я перажывала да фізічнага болю ў грудзях сваю адарванасць, адзіноту і плакала, плакала бясконца. Як балюча і крыўдна, што ўсё, створанае з любоўю, і ўсё такое любімае ў родным Мінску, — усё так паварварску знішчана, і ўсё патрэбна пачынаць ізноў.

Прывітанне ўсім, усім, мае родныя і дарагія, прывітанне! Ці памятаеце і любіце Вы мяне, як памятаю і люблю я?! Які гэта будзе цудоўны непаўторны дзень, калі я Вас усіх убачу, калі Вы ўсе вернецеся ў Мінск! Я ўсё ўяўляю сабе, якія Вы зараз усе: і Уладамірскі, і Глебаў, і Галіна, і Ждановіч, і Ржэцкая, і Рахленка, і Кудраўцаў, і Станюта, і Шапко, і Бірыла, і Лідская, і Пола, і Фаня Яфімаўна1), і Аркадзь Рыгоравіч2), і ўсе, усе, — і ўсё ніяк не магу ўявіць. Хора Крыгель3) ужо старэнькая ці такая, як была? А Міхась Пржыбытка4)? А Грыша Злотнікаў5)?

Фаня Яфімаўна, чырвоны занавес, пра які Вы так турбаваліся, нягоднікі знялі і ён знік, невядома — украдзены ці вывезены. Няма і машынак у тэатры, якіх ужо было тры. Іх вывезлі ваенныя савецкія часці, калі ўвайшлі ў горад. Калі ёсць магчымасць — вязіце з Томска. Вядома, увесь гардэроб расцягнулі, як і ўсё ў горадзе пасля змены ўлады. Тэхнічны штат амаль увесь на месцы, акрамя Пужэвіча і Карабыкі, якія памерлі з голаду.

На гэтым канчаю, ужо зусім цёмна, святла няма, ды і шмат нешта атрымалася.

Яшчэ раз прывітанне ўсім.

ЗІНА.

Публікацыю падрыхтавала Таццяна КЕКЕЛЕВА, навуковы супрацоўнік БДАМЛіМ

---

1) Алер, дырэктар БДТ-1.
2) Гайдарын, намеснік дырэктара БДТ-1.
3) Загадчык касцюмернага цэха.
4) Машыніст сцэны.
5) Вядучы спектакляў.

ЛіМ ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ

Саюз беларускіх пісьменнікаў; Міністэрства культуры і друку Рэспублікі Беларусь; калектыў рэдакцыі газеты "Літаратура і мастацтва"

ВЫХОДЗІЦЬ З 1932 ГОДА

Газету рэдагавалі

Х.Дунец	(1932-35)
І.Гурскі	(1935-41)
А.Куляшоў	(1945-46)
М.Горцаў	(1947-49)
П.Кавалёў	(1949-50)
В.Вітка	(1951-57)
М.Ткачоў	(1957-59)
Я.Шарахоўскі	(1959-61)
Н.Пашкевіч	(1961-69)
Л.Прокша	(1969-72)
Х.Жычка	(1972-76)
А.Асіпенка	(1976-80)
А.Жук	(1980-86)
А.Вярцінскі	(1986-90)

Галоўны рэдактар Мікола ГІЛЬ

РЭДАКЦЫЙНАЯ РАДА:
Святлана БЕРАСЦЕНЬ, Міхась ЗАМСКІ, Галіна КАРЖАНЕЎСКАЯ, Жана ЛАШКЕВІЧ, Алесь МАРЦІНОВІЧ, Барыс ПЯТРОВІЧ — *першы намеснік галоўнага рэдактара,* Юрась СВІРКА, Віктар ШНІП — *намеснік галоўнага рэдактара*

АДРАС РЭДАКЦЫІ:
220600, ГСП, Мінск, вул. Захарава, 19

ТЭЛЕФОНЫ:
прыёмная рэдакцыі — 332-461
намеснікі галоўнага рэдактара — 332-525, 331-985
аддзелы:
публіцыстыкі — 332-525
пісьмаў і грамадскай думкі — 331-985
літаратурнага жыцця — 332-462
крытыкі і бібліяграфіі — 332-204
паэзіі і прозы — 332-204
музыкі — 332-153
тэатра, кіно і тэлебачання — 332-153
выяўленчага мастацтва і аховы помнікаў — 332-462
навін — 332-462
мастацкага афармлення — 332-204
фотакарэспандэнт — 332-462
бухгалтэрыя — 268-640

Пры перадруку просьба спасылацца на "ЛіМ".
Рукапісаў рэдакцыя не вяртае і не рэцэнзуе.
Пазіцыя рэдакцыі можа не супадаць з думкамі і меркаваннямі аўтараў публікацый.

Набор і вёрстка камп'ютэрнага цэнтра "ЛіМ"
Апаратныя сродкі і тэхнічная падтрымка — фірма "Дайнова"

Выходзіць раз на тыдзень па пятніцах

Друкарня "Беларускі Дом друку" (г. Мінск, пр. Ф. Скарыны, 77)

Індэкс 63856. Наклад 6459.
Нумар падпісаны 12.10.1995 г.
Заказ 5210.

П123456789101112
М123456789101112